МОРА
НА ВЁСЦЫ
5

ХАМА́М
І САЎНА
Ў ПУХАВІЦКІМ
БАСЕЙНЕ

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 чэрвеня 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 123 (29237)

9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Яўген УВЯДЗЕНСКІ, дырэктар УП «Белінтэрэкспа» Беларускай гандлёва-прамысловай палаты:

«Віртуальныя выстаўкі — выдатнае часовае рашэнне ў перыяд прыпынення рэальных мерапрыемстваў, але пасля аднаўлення нармальнай выставачнай дзейнасці асноўным рэсурсам зноў стануць класічныя выстаўкі. Аднак тыя анлайн-рашэнні, якія мы цяпер распрацоўваем, будуць дадаткам, своеасаблівым люстэркам рэальнай экспазіцыі ў інтэрнэце, якую змогуць наведаць тыя, хто не паспеў прыехаць на выстаўку».

КАРАТКА

- Беларускія навукоўцы вывучаюць асаблівасці імунітэту пры COVID-19.

- **Адвакаты 26 чэрвеня бясплатна пракансультуюць маламаёмных грамадзян.**
- Дэпутаты зацвердзілі справаздачу аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за 2019 год.
- **Пагадненне аб дзецях з 1 ліпеня змогуць заключыць бацькі, якія не знаходзяцца ў шлюбе.**
- Летапіс фестывалю нацыянальных культур ад фотакара БелТА прадставілі ў Гродне.
- **Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў дзейнічаюць у 24 раёнах Беларусі.**

Рэпартаж

СПЯКОТА, ПАНДЭМІЯ І ЦТ

Для абітурыентаў створаны ўсе ўмовы, каб яны маглі сканцэнтравацца на рашэнні тэстаў

Для разноскі тэстаў ва ўсе аўдыторыі рыхтуюцца спецыяльныя пакеты з сакрэтнай стужкай. Як толькі цэласнасць стужкі парушаецца, на ёй праступаюць схаваныя ад вачэй сімвалы.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Учора ў 11.00 у краіне стартавала цэнтралізаванае тэсціраванне. Але ўжо ў 9.30 побач з галоўным будынкам Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта дысцыплінаваныя абітурыенты, якія прыйшлі ў пункт тэсціравання загадзя, выстраіліся ў чаргу.

Беларускую мову (а менавіта з тэста па беларускай мове і распачаўся двухтыднёвы экзаменацыйны марафон) сёлета пажадалі здаваць 18,6 тысячы чалавек па ўсёй краіне. Для параўнання: на рускую мову зарэгістраваліся 52 тысячы чалавек. Як бачым, прапорцыя зусім не на карысць роднай мовы, нават калі ўлічыць, што некаторыя абітурыенты будуць здаваць дзве дзяржаўныя мовы. Такое права ў іх ёсць: каля 40 працэнтаў афармілі пропускі на чатыры прадметы.

У БДПУ для ўдзелу ў ЦТ па беларускай мове зарэгістраваўся 931 абітурыент. Для таго каб рассадзіць гэтую колькасць удзельнікаў экзамену з патрабаваннем захавання сацыяльнай дыстанцыі не менш за метр, спатрэбілася задзейнічаць 24 аўдыторыі. А пад рускую мову 26 чэрвеня ў БДПУ зарэзервавана ўдвая больш памяшканняў і дадатковыя вучэбныя карпусы. Увогуле пра тое, што прыёмная кампанія праходзіць сёлета ва ўмовах пандэміі, нагадвае абсалютна ўсё: паўсюдна ў свабодным доступе знаходзяцца антысептыкі для рук, а ў холе галоўнага корпуса — няпамятлівыя абітурыенты маглі набыць не толькі ручку з чорным чарнілам, але і маску, і вільготныя сурвэткі. Дарэчы, у БДПУ ўсім абітурыентам было рэкамендавана захоўваць масачны рэжым. Для тых, хто забыўся пра маску, у аўдыторыях быў створаны рэзерв індывідуальных сродкаў абароны. Усе арганізатары ЦТ ва ўніверсітэце былі ў масках і аднаразовых пальчатках.

На ўваходзе абітурыенты праходзяць строгі фэйс-кантроль: арганізатары супастаўляюць фота ў дакументах, так бы мовіць, з «арыгіналам». Калі сумняваюцца, просяць зняць маску. «Шукаем сваё прозвішча ў спісах. Не затрымліваемся, праходзім у гардэроб і здаём усе свае рэчы», — арыентуюць абітурыентаў, якія ўжо трапілі ў вучэбны корпус, шматлікія валанцёры. Каму патрабуецца, дапамагаюць знайсці экзаменацыйную аўдыторыю, бо заблытацца ў карпусах педуніверсітэта даволі проста. Валанцёры вылучаюцца сярод вялікай колькасці маладых людзей фірменнай жоўта-блакітнай універсітэцкай атрыбутыкай і... сваімі добразычлівымі ўсмешкамі. Будучыя педагогі выдатна разумеюць, наколькі важная падтрымка ў сітуацыі стрэсу, тым больш што і самі яны яшчэ не забыліся пра ўласныя эмоцыі ад ўступных экзаменаў. Дарэчы, у валанцёрскі атрад БДПУ «Штаб абітурыента» адбіраюць найлепшых, бо добра разумеюць, што падчас прыёмнай кампаніі валанцёры становяцца абліччам універсітэта.

СТАР. 3

Жыццё не спыняецца

«КІНА НЕ БУДЗЕ?»

Як выжываюць у крызіс кінатэатры ў рэгіёнах

Праз пандэмію новага каранавіруса сёлета змяніліся многія сферы жыцця, і не ў апошнюю чаргу культурная. Ва ўсім свеце музеі і тэатры, фестывалі і канцэртныя залы вымушаныя былі часова прыпыніць сваю дзейнасць альбо пераходзіць у анлайн-фармат. Тое самае адбываецца і ў Беларусі. У сталіцы, напрыклад, раней часу скончыў сезон Белдзяржцырк, абмежавалі час работы музеі, а ў красавіку зачыніліся практычна ўсе кінатэатры, за выключэннем шматзальнай «Беларусі». Па-рознаму з гэтай сітуацыяй справіліся ў рэгіёнах — дзе, як у Брэсце, змянілі графік работы, дзе, як у Гродне, адкрылі аўтакінатэатр і летнія пляцоўкі на свежым паветры, дзе прынялі захады па рассадцы гледачоў, каб не зачыняцца і не сыходзіць у «мінус»...

— Усе мы ў адной лодцы, і дзяржаўныя ўстановы, і прыватнікі, — сустракае нас у фае амаль што цёзкі, баранавіцкага кінатэатра «Звезда», **упраўляючы Уладзімір БОЎФАЛІК.** — Сусветныя кінапрэм'еры адклаліся на нявызначаны тэрмін, правы на пракат многіх фільмаў скончыліся, выкручваемся як можам.

Будынак «Звезды» старэйшы за сам кінатэатр амаль на паўстагоддзя: ён узведзены ў 1957-м (а кінатэатр адкрыты ў 2006-м), і гэты каларыт мінулага, натуральна, адразу бачыш звонку. Тым больш нечакана зазірнуць у тры цалкам сучасныя кіназалы, дзіцячы гульнявы лабірынт, буфет, дзе навідавоку стаіць сродак для дэзынфекцыі рук, а бармены працуюць у масках і пальчатках.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X
20123
9 771990 763008

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы звычайная сярэднееўрапейская краіна, міралюбная, накіраваная на спакойнае жыццё»

У кадравы чацвер Прэзідэнт Беларусі не толькі ўзгадніў прызначэнні ў рэспубліканскія, мясцовыя органы ўлады і на дыпламатычныя пасады, але і выказаўся наконт фэйкаў у тэлеграм-каналах.

Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў прызначэнне Андрэя Седукова старшынёй Крычаўскага райвыканкама. Аляксандра Ганевіча і Андрэя Молчана ён назначыў Надзвычайнымі і Паўнамоцнымі Пасламі адпаведна ў Швейцарскую Канфедэрацыю і Баліварыянскую Рэспубліку Венесуэлу. Кандыдатуру Ілы Лапуця ўзгадніў на пасаду Генеральнага консула ў горадзе Даўгаўпілсе (Латвійская Рэспубліка).

Таксама павышэнне да пасады першага намесніка міністра эканомікі атрымаў Юрый Чабатар. Анжаліка Нікіціна стала намеснікам міністра эканомікі. Міхаіл Лабароў узгоднены членам Брэсцкага аблвыканкама. Начальнікам дэпартамента эканомікі і галіновых праграм Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы стала Святлана Іванова.

Звяртаючыся да новапрызначаных, Прэзідэнт заўважыў, што яны самі добра ведаюць, з чым давядзецца сутыкнуцца падчас работы на пасадах.

Каментуючы прызначэнні, Прэзідэнт звярнуў увагу, што на грамадства «ідзе моцны ціск, асабліва ў інтэрнэце».

«Вы ж бачыце, вакол фэйкі, жудасныя фэйкі, якія мяне проста здзіўляюць. Мне далажылі, ужо было даўно, што ў аднаго з маіх сыноў у Швейцарыі 840 мільёнаў долараў. Я бачыў, мне паказалі. Накіруйце туды па дыпламатычных каналах ліст: хто хоча забраць гэтыя грошы, няхай неадкладна забярэ, — сказаў ён, адзначыўшы, што вядомы тэлеграм-канал нават друкуе лжывыя дакументы. — ***Такія фэйкі будуць заўсёды, і нам трэба гэта мець на ўвазе,*** з гэтым жыць і змагацца». Па словах кіраўніка краіны, лжывыя звесткі ідуць і з Расіі.

Прэзідэнт адзначыў, што ўлады «павінны тлумачыць людзям, што адбываецца». «Яны (апаненты. — **«Зв.»**) патрабуюць ад нас сумленных выбараў і перадвыбарчай барацьбы, а гэта як называецца? Яны ж нас штурхаюць на несумленнасць, як яны паводзяць сябе. Зразумела, што за імі стаяць лялькаводы. Яны і з аднаго, і з другога боку. Яны і ў Польшчы жывуць, і з Расіі падкідваюць. Мы пра гэта пры сустрэчы ў найбліжэйшы час з Прэзідэнтам Пуціным пагаворым», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, сітуацыя ўскладняецца і тым, што «ўжываюцца самыя сучасныя фальшывыя тэхналогіі, ідзе ўмяшанне з-за мяжы ў нашы выбары, унутраныя справы».

«Мы не ядзерная дзяржава, мы не можам узяць ядзерную боегалоўку, размахваць і крычаць пра гіпергукавую зброю, што мы вам адкажам. ***Мы звычайная сярэднееўрапейская краіна, міралюбная, накіраваная на спакойнае жыццё***, і пагражаць у сувязі з гэтым мы не можам, — сказаў Прэзідэнт. — Адключыць інтэрнэт? Можна, але ўжо праблематычна: акрамя таго, што гэта сметніца, гэта і вялікае дасягненне чалавецтва».

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Пра задачы па развіцці двухбаковых адносін расказалі журналістам прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса

Аляксандр ГАНЕВІЧ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Швейцарскай Канфедэрацыі: «Мы будем выкарыстоўваць створаную асацыяцыю сяброўства Беларусі і Швейцарыі, міжпарламенцкую групу сяброўства і створаны ў гэтым рэгіёне інстытут ганаровых консулаў. Безумоўна, кіраўнік краіны паставіў задачы і па развіцці гандлёва-эканамічных адносін. У нас апошнія тры гады ідзе стабільны рост тавараабароту, летась рост быў 136 працэнтаў і тавараабарот дасягнуў 258 мільёнаў долараў».

Андрэй МОЛЧАН, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Баліварыянскай Рэспубліцы Венесуэла: «Венесуэла сёння з'яўляецца цікавым кейсам з пункту гледжання дыпламатыі, палітыкі і геапалітыкі. Венесуэла — адзін з найбуйнейшых пунктаў апоры на далёкай дузе для Рэспублікі Беларусь. За апошнія 12 гадоў мы там стварылі каласальны плацдарм для прасоўвання эканамічных, палітычных і гуманітарных інтарэсаў Беларусі на лацінаамерыканскім кантыненце. Кіраўнік краіны падкрэсліў, што Венесуэла застаецца блізкім, стратэгічным партнёрам Рэспублікі Беларусь і нам трэба ўважліва прааналізаваць сітуацыю, якая там складваецца, і выпрацаваць максімальна эфектыўныя і ўзаемавыгадныя формы работы».

Ілья ЛАПУЦЬ, Генеральны консул Беларусі ў горадзе Даўгаўпілсе (Латвійская Рэспубліка): «Латвія як краіна Еўрасаюза мае для нас асаблівае значэнне. З'яўляючыся краінай ЕС, яна — яскравы прыклад таго, як магчыма сябраваць з Беларуссю. У нас вельмі моцныя сувязі ва ўсіх сферах — эканоміцы, палітыцы, культуры, але ўсё гэта будуецца на блізкіх адносінах паміж нашымі людзьмі, якія жывуць у тым рэгіёне. Гэта адзіная краіна, з якой у нас дзейнічае пагадненне аб бязвізавых паездках для прыгранічнага насельніцтва. Прэзідэнт паставіў задачу падтрымліваць нашых грамадзян, якія там жыве значная колькасць».

Старшыня Крычаўскага райвыканкама Андрэй СЕДУКОЎ расказаў, што ў гэтай частцы паўднёва-ўсходняга рэгіёна работа будзе накіравана на прыцягненне інвестараў, стварэнне ўмоў для развіцця сельскай гаспадаркі.

«Будзем займацца аднаўленнем і будаўніцтвам дарог, якія гэтага будуць патрабаваць, будзем даглядаць аб'екты інфраструктуры, сацыяльныя аб'екты, якія неабходна ўключаць у праграму на пяцігодку наперад. Яны будуць фінансавацца з абласнога бюджэту», — сказаў ён.

Юрый КАРАЕЎ:

«ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ЦАЛКАМ СВЯДОМА»

Міністр унутраных спраў пракаментаваў нападкі на сваё ведамства

На пасяджэнні другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі парламентарыі папрасілі міністра выказаць меркаванне наконт негатыву, які ліецца зараз на МУС з нагоды затрыманняў людзей падчас збору подпісаў ініцыятыўнымі групамі.

«Людзі, якія хочуць зрабіць вулічную рэвалюцыю, вулічныя пратэсты, вельмі добра арганізаваныя. Апошнія стрымы радыё «Свабода» 18-19-га замянілі сабою стрымы Ціханоўскага. У бягучым радку з каментарыямі яны самаарганізоўваліся, арганізоўваліся з кімсьці: «Змяшчаемся ўправа... Змяшчаемся ўлева... Разрыў ланцужка». Ужо аб'явілі, што пікет скончыўся і што мэты пікета па подпісах няма, — але яны ж не сыходзяць. Значыць, дзейнічаюць цалкам свядома, разумеючы цудоўна, што вынайшлі і дэманструюць новую форму масавага мерапрыемства», — далажыў дэпутатам міністр.

Сутнасць вялікай колькасці людзей ад яе знешняга выгляду (натоўп ці ланцуг) не мяняецца, падкрэсліў Юрый Караеў. Па яго словах, кіруецца такая вялікая колькасць праз тэлеграм-каналы і стрымы.

«Глядзець бездапаможна, як яны гэта робяць, мы таксама не збіраліся, трэба неяк рэагаваць... Другая небяспека, што яны сваім знаходжаннем у самым ажыўленым цэнтры прыцягваюць і разявак, і спачувальнікаў, і тых, хто не разбіраецца. Любое масавае мерапрыемства небяспечнае тым, што яно ў сваю арбіту ўцягвае недатычных. А ўдзельнікі потым пачынаюць крычаць: «А я ішла з крамы», але ж мы па відэа бачым, што ты не з крамы ішла, а стала ў гэтую чаргу», — падкрэсліў Юрый Караеў.

Нагадаў ён і нашумелы выпадак з урачом-анколагам.

«Нібыта ішоў з сябрамі, выпадкова. Начальнік прэс-службы МУС даказала на відэа, што не ішоў ён выпадкова, а стаяў у гэтым ланцужку свядома. Але паколькі цяпер модна прыкрывацца ўрачамі: «Урач лечыць, а вы яго, міліцыянеры, схапілі», — нашымі ідэалагічнымі апанентамі выхопліваюцца менавіта такія рэчы», — растлумачыў кіраўнік МУС.

Рыхтуючыся да падзей, міністр асабіста давёў начальнікам упраўлення і аддзелаў унутраных спраў, а тыя супрацоўнікам, — не датыкацца да маладых дзяўчат, інвалідаў.

«Калі мы выціскаем гэты ланцужок, хто не сыходзіць, абыходзіць бокам. Рукі за спіну, таварышы міліцыянеры, нікога не хапаць. Першы раз мы проста папярэджваем і прарэджваем. Мяне зразумелі і так і дзейнічалі. Але 19-га ланцужок згарнуўся, тыя, хто хацеў, сталі за нашым ланцужком у новую чаргу, нарываліся спецыяльна... Другі раз і трэці іх папярэдзілі — яны не разыходзяцца. Як кажуць, дзяцей, старых, жанчын і абозы не чапаць — толькі тых, хто хоча процідзейнічаць, хто ідзе грудзьмі на АМАПаўцаў. Так і выконвалася», — запэўніў міністр.

Ён падкрэсліў, што ў кожнага міліцыянера з атрада асобага прызначэння павінны быць выбіральнасць, гуманнасць і розум. Хапаць інвалідаў нельга, падкрэсліў Юрый Караеў, за выпадкі затрымання такіх асоб папросяць прабачэння.

«Думаю, хто ў гэты ланцужок станавіўся, гэта ўсё разлічвалі... Мы проста павінны быць больш вытрыманымі ў дзясяткі разоў, таму што нас абвінаваціць лёгка. ДАІшнік, які прылажыўся да галавы затрыманага, што шалёна супраціўляўся, імгненна параўнаны з паліцэйскім, які Флойда прыдушыў. АМАПавец пераступае праз бабулю, што лягла перад ім, а з усіх шматлікіх фотаздымкаў выдаецца той, дзе яго нага занесеная... Гэта інфармацыйная, ідэалагічная барацьба», — заключыў міністр. Ён лічыць неабходным павялічыць колькасць груп дакументавання ў падобных месцах.

Юрый Караеў расказаў аб патрабаваннях выпусціць «палітвязняў» і пагрозах выбуху ў адваротным выпадку, якія атрымліваюць органы аховы правапарадку. МУС гатовы да такіх акцый, якія разлічаны на эскалацыю канфлікту.

«Мы павінны адказваць адэкватна і высвечваць нашы меры — абаронныя, няжорсткія, несадысцкія, некатаўскія. Канструктыўныя», — упэўнены міністр.

Варвара МАРОЗАВА.

Меркаванні

МЫ САМІ ВЫРАШЫМ, ЯК ЖЫЦЬ ДАЛЕЙ

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ўпэўнены, што сітуацыю, якая адбываецца ў краіне ў перадвыбарны перыяд, спрашчаць нельга:

— Трэба выдатна разумець, што ва ўсіх гэтых дзеянняў ёсць заказчыкі і ёсць выканаўцы. Ёсць мэты, якія яны ставяць. Не ўсім падабаецца тая палітыка, якая праводзіцца ў Беларусі, Прэзідэнтам Беларусі. І вы ведаеце, каму гэта не падабаецца. Ёсць банкі, праз якія ідзе прапампоўка грошай, каб падтрымліваць тыя негатыўныя працэсы, якія сёння ідуць у Беларусі.

Таму задача і праваахоўных органаў, і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў адназначная — выкананне Канстытуцыі, заканадаўства. Вядома, нам трэба больш сустракацца з людзьмі, гаварыць з імі. Мы праводзім сустрэчы ў рэгіёнах, з актывам. Гэтыя сустрэчы ўжо праведзены ў Магілёўскай, Брэсцкай, Гродзенскай, сёння (26-га) — у Мінскай, потым у Мінску і, нарэшце, у Віцебскай.

Праводзім такія сустрэчы і ў буйных гарадах. У прыватнасці, я ўжо сустрэўся з актывам і з апазіцыяй у Полацку, Наваполацку. Падрыхтаванасць дэпутатаў і матэрыялы, якія ў нас ёсць, дазваляюць даць аб'ектыўную ацэнку працэсам, якія адбываюцца.

Мы назначылі выбары, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, і мы мусім зрабіць усё, каб яны праходзілі ў прававым рэчышчы.

Алег ДЗЯЧЭНКА, прарэктар па вучэбнай рабоце Магілёўскага ўніверсітэта імя Куляшова, член Савета Рэспублікі ад Магілёўскай вобласці:

— Няма большай каштоўнасці, чым суверэнная і незалежная Беларусь. Больш за два стагоддзі мы ішлі да незалежнасці. Усякае было на тым шляху — гісторыкі добра ведаюць пра гэта. Але ў складаных эканамічных і палітычных умовах наш народ пабудаваў дзяржаву. Падкрэслю — нацыянальную дзяржаву. Дзяржаву беларускага народа. Дзяржаву, у якой вольна сябе адчуваюць прадстаўнікі больш чым 100 этнічных і нацыянальных супольнасцяў. У нас дзве дзяржаўныя мовы (у 1920-х было чатыры). І сёння ад кожнага з нас залежыць, захаваем мы суверэнітэт — вялікую каштоўнасць беларускай нацыі — ці не. Таму не трэба беларусам скакаць пад дудкі замежных кансультантаў і глядзець на тое, што гэтыя дзядзькі там падумаюць пра нашы ўнутраныя палітычныя справы. У нас ёсць свая дзяржава, краіна для жыцця, і мы самі вырашым, як далей развіваць нашу эканоміку, палітыку і грамадства.

Васіліса МАРЗАЛЮК, чэмпіёнка Еўрапейскіх гульняў 2015 і 2019 гадоў, шматразовы прызёр чэмпіянатаў свету і Еўропы па вольнай барацьбе:

— Я ў прынцыпе стараюся абстрагавацца ад палітыкі, лічу, што не варта выказваць меркаванне наконт сваіх пераваг у гэтай сферы публічна. Яго я абсалютна дакладна выкажу 9 жніўня, калі прыйду на выбары. Як, напэўна, і кожны нармальны законапаслухмяны грамадзянін. Але пра тое, што адбываецца зараз у інтэрнэт-прасторы, не сказаць нельга. Здзіўляе і выклікае непаразуменне тое, што спартсмены, якія выказваюцца за цяперашнюю ўладу і добра адгукаюцца пра нашу краіну, атрымліваюць у адказ столькі хайпу, негатыву ў свой адрас. Але калі мы хочам дэмакратыі, калі пра яе гаворым, то кожны можа выказваць сваё меркаванне, а не падстройвацца пад чыёсці, ці не так? Вельмі крыўдна і сумна назіраць, як людзі крыўдзяць адно аднаго цяпер на форумах і ў каментарыях.

СПЯКОТА, ПАНДЭМІЯ І ЦТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усе арганізацыйныя моманты добра прадуманы, таму чарга на ўваходзе хутка растваралася. У 10.30 большасць абітурыентаў ужо занялі свае месцы ў памяшканнях. Перад аўдыторыяй хлопцы і дзяўчаты праходзяць яшчэ адзін пашпартны кантроль і цягнуць нумар свайго месца. Ад яго будзе залежаць варыянт тэста.

Каб асабіста пераканацца ў тым, што ўсё арганізавана належным чынам, у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт завітаў **старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

— Міністэрства адукацыі і ВНУ добра падрыхтаваліся. Не было чэргаў перад аўдыторыямі, прынцып дыстанцыравання і ўсе супрацьэпідэмічныя меры былі цалкам выкананыя, — падзяліўся ён сваімі ўражаннямі ад убачанага. — З улікам эпідэміялагічнай сітуацыі сёлета паўсюдна давялося павялічыць аўдыторны фонд для ЦТ. Рассаджванне ўдзельнікаў ЦТ забяспечваецца на адлегласці не менш за адзін метр, а колькасць абітурыентаў у аўдыторыі не перавышае 50 чалавек. Для правядзення ЦТ па двух найбольш масавых вучэбных прадметах (руская мова і матэматыка) сёлета прадугледжана па два дні. Павялічана таксама колькасць пунктаў тэсціравання ў рэзервовыя дні: калі раней гэта быў толькі БДУ, то ў гэтым годзе вызначаны ВНУ ў кожным з абласных цэнтраў (усяго шэсць пунктаў). Створана бяспечнае з пункту погляду эпідэміялагічнай абстаноўкі асяроддзе, каб абітурыенты маглі сканцэнтравацца на рашэнні тэстаў. Вядома, удзельнікі ЦТ хвалююцца. Мы гэта бачым, але гэта натуральны працэс. Таму пры наведванні аўдыторый спрабавалі іх заспакоіць і падтрымаць, казалі ім, што ў тэстах няма заданняў, якія выходзяць за рамкі школьнай праграмы, і калі яны сумленна працавалі ў школе і рыхтаваліся да ЦТ, то ніякіх нечаканасцяў не будзе.

Як адзначыў віцэ-прэм'ер, у тых абітурыентаў, якія цяпер знаходзяцца на самаізаляцыі, будзе магчымасць у рэзервовыя дні здаць ЦТ. Створаны ўмовы і для абітурыентаў з Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана. Яны могуць здаць ЦТ у рэзервовыя дні, каб паступіць у беларускія ВНУ. «Міністэрства аховы здароўя разам з Міністэрствам адукацыі падрыхтавалі метадычныя рэкамендацыі, каб абітурыенты, якія прыедуць з-за мяжы, маглі без 14-дзённага тэрміну самаізаляцыі прадэманстраваць свае веды», — праінфармаваў Ігар Петрышэнка.

У 10.15 на вачах у журналістаў арганізацыйная камісія разам з прадстаўнікамі Камітэта дзяржкантролю адчыніла сейф, куды трыма гадзінамі раней былі змешчаны матэрыялы цэнтралізаванага тэсціравання. Іх дастаўкай па ўсёй краіне займаюцца кур'еры фельд'егерскай службы. Матэрыялы ЦТ прывозяцца ў апламбаваных сумках накшталт інкасатарскіх. Для разноскі тэстаў ва ўсе аўдыторыі, дзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, рыхтуюцца спецыяльныя пакеты з сакрэтнай стужкай, якія проста немагчыма ўскрыць непрыкметна, скажам, на шляху ад сейфа да памяшканняў. На кожную аўдыторыю запаўняецца акт, у якім пазначана не толькі колькасць бланкаў, але і іх нумары, таму чужыя бланкі апынуцца ў пакеце не могуць. Да таго ж і арганізатары ЦТ у пакоі пацвярджаюць сваімі подпісамі, што менавіта гэты бланк знаходзіўся ў экзаменацыйнай аўдыторыі. У сейфе застаюцца толькі два рэзервовыя пакеты: адзін з бланкамі адказаў і другі — з педагагічнымі тэстамі на той выпадак, калі раптам ужо ў аўдыторыях выявіцца друкарскі брак на паперы.

Кантроль за правядзеннем уступных выпрабаванняў і забеспячэннем для абітурыентаў роўных магчымасцяў ажыццяўляе дзяржаўная камісія. У дзяржкамісіі створана рабочая група, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, Камітэта дзяржкантролю, Міністэрства адукацыі і МУС.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Камісіі па кантролі за ходам уступных выпрабаванняў працуюць ва ўсіх установах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Іх старшынямі з'яўляюцца члены дзяржкамісіі, а намеснікамі — работнікі Камітэта дзяржкантролю. Усяго па краіне ва ўступнай кампаніі задзейнічана больш за 220 работнікаў Камітэта дзяржкантролю, якія будуць кантраляваць усе этапы ўступнай кампаніі: ад правядзення тэставых выпрабаванняў да падачы дакументаў у прыёмныя камісіі і залічэння, — падкрэслівае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення кантролю бюджэтна-фінансавай сферы — начальнік упраўлення кантролю за работай галін сацыяльнай сферы КДК Віктар БУРЛО.** — Лёсаванне, дарэчы, праходзяць не толькі абітурыенты, але і члены арганізацыйнай камісіі: ніхто загадзя не ведае, у якой аўдыторыі ён апынецца. Разам з выкананнем задач па прадухіленні парушэнняў члены дзяржкамісіі будуць аб'ектыўна і ў сціслыя тэрміны разглядаць звароты абітурыентаў і іх бацькоў. Для аператыўнага рэагавання на базе Камітэта дзяржаўнага кантролю і абласных камітэтаў дзяржкантролю арганізавана работа гарачых ліній, будзе праводзіцца таксама асабісты прыём абітурыентаў і іх бацькоў.

Гарачыя тэлефонныя лініі дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам уступных выпрабаванняў створаны для абітурыентаў на базе цэнтральнага апарата Камітэта дзяржаўнага кантролю і камітэтаў у абласцях. Нумары тэлефонаў: рабочай групы дзяржкамісіі ў Мінску — (017) 327 66 80; Брэсцкай абласной камісіі — (0162) 21 18 76 і 21 18 94; Віцебскай абласной камісіі — (0212) 37 61 93 і 37 61 82; Гомельскай абласной камісіі — (0232) 23 83 85; Гродзенскай абласной камісіі — (0152) 79 88 01, 79 88 40 і 79 88 16; Магілёўскай абласной камісіі — (0222) 22 18 97, 31 07 73 і 31 07 75 і Мінскай абласной камісіі — (017) 284 09 06 і 284 05 90. Гарачая лінія Міністэрства адукацыі — (017) 222 43 12.

Віктар Бурло расказаў, што ў рабочую групу ў чэрвені ўжо паступалі звароты, звязаныя з рэгістрацыяй на ЦТ. Некаторыя абітурыенты не змаглі ўкласціся ў тэрміны, адведзеныя для яе. Па кожным канкрэтным выпадку прымалася рашэнне аб допуску да ЦТ. Апошнія звароты паступілі літаральна за некалькі дзён да старту цэнтралізаванага тэсціравання, таму гэтым маладым людзям дазволяць праходзіць яго ўжо толькі ў рэзервовыя дні.

Сёлета ўсім прэтэндэнтам было рэкамендавана прытрымлівацца дзелавога стылю ў адзенні. Гэта было сказана ў памятцы ўдзельніку ЦТ, але абітурыенты ўсё роўна адзяваюцца так, як ім зручна, — прыходзяць на экзамен і ў шортах. «Мы, канешне, звяртаем увагу на знешні выгляд, але, улічваючы спякотнае надвор'е , незахаванне дзелавога стылю не будзе крытычным, каб не дапусціць абітурыента да ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні», — заўважыў Віктар Бурло.

Перад пачаткам ЦТ усім прэтэндэнтам яшчэ раз нагадваюць пра неабходнасць здаць мабільныя тэлефоны. За выяўленне гэтай прылады ў экзаменацыйнай аўдыторыі гаспадар пазбаўляецца магчымасці пераздаць ЦТ і аказваецца за бортам прыёмнай кампаніі. Абскардзіць такое рашэнне немагчыма. Дзеля справядлівасці трэба дадаць, што мабільныя тэлефоны забараняецца мець у экзаменацыйнай аўдыторыі не толькі абітурыентам, але і арганізатарам ЦТ.

А вось калі самаадчуванне на экзамене пагоршыцца, то гэта будзе падставай для таго, каб здаць экзамен у рэзервовы дзень. Праўда, такі факт абавязкова павінен засведчыць медыцынскі работнік у пункце здачы ЦТ.

У 11.05 камісія распячатвае канверт з бланкамі адказаў, а затым і з тэставымі заданнямі. Пасля ўскрыцця пакета з педагагічнымі тэстамі абітурыенты ў аўдыторыю ўжо не дапускаюцца. Журналістаў просяць пакінуць памяшканне. Адлік часу пайшоў...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Блізкая ўлада

ЗВАНІЦЕ НА ГАРАЧЫ ТЭЛЕФОН

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 27 чэрвеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Канстанцінавіч ЗАЯЦ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;
- першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

З АЎТОРКА ПАХАЛАДАЕ

Незвычайны па аб'ёме скандынаўскі антыцыклон, які размясціўся над тэрыторыяй Беларусі, прынёс нам вельмі цёплае і сухое надвор'е. Сёння змен у сінаптычнай сітуацыі не адбудзецца. Чакаецца хутчэй ліпеньская спёка, калі ў разгар дня будзе да 26—31 цяпла. І ў выхадныя захаваецца цёплае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу ўначы вялікая частка краіны застанецца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску, удзень з тэрыторыі Польшчы на заходнюю частку краіны перамесціцца франтальная сістэма. Уначы месцамі па Брэсцкай вобласці, раніцай і ўдзень па заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Уначы стане вельмі камфортна, калі тэмпература паветра не будзе апускацца ніжэй чым плюс 12—18 градусаў, а ўдзень стане яшчэ цяплей — да 24—30 цяпла.

На наступны дзень тэрыторыю нашай краіны наведаюць атмасферныя франты, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы. На большай частцы краіны ў нядзелю чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Уначы стане наогул душна, бо сіноптыкі прагназуюць ад плюс 14 да плюс 19 градусаў, а ўдзень спякота злёгку спадзе і стане ад 22 да 29 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня тэрыторыя краіны застанецца пад уплывам атмасферных франтоў, за якімі пачне паступаць халодная паветраная маса паўночнаатлантычнага паходжання. Яна спачатку прынясе даволі свежае паветра, а потым і воблачнасць. А з аўторка ў нашым рэгіёне ўсталюецца адносна халоднае для гэтага часу надвор'е.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Японія адмовілася ад размяшчэння амерыканскай сістэмы супрацьракетнай абароны

Японскі ўрад пачаў перагляд сваёй палітыкі нацыянальнай бяспекі пасля рашэння прыпыніць рэалізацыю плана разгортвання амерыканскай наземнай сістэмы супрацьракетнай абароны Aegis Ashore, паведаміла агенцтва «Дзідзі Цусін». Пра прыпыненне плана паведаміў міністр абароны Тара Кона на сустрэчы прэм'ер-міністра Сіндза Абэ з ключавымі міністрамі кабінета. Кона раней казаў, што Японія можа адмовіцца ад Aegis Ashore з-за рызыкі падзення ракетных паскаральнікаў пасля пуску на жылыя кварталы за межамі палігона, а таксама адзначаў тэхнічныя праблемы і высокія затраты. Разам з тым, як вынікае з паведамлення, гэтае рашэнне можа быць не канчатковым, бо перагаворы з амерыканскім бокам усё яшчэ працягваюцца. Як вядома, у 2017 годзе Японія прыняла рашэнне аб размяшчэнні двух амерыканскіх комплексаў Aegis Ashore на сваёй тэрыторыі на фоне ракетных пускаў у КНДР.

Ва Украіне маштабная паводка

Прынамсі тры чалавекі загінулі і адзін прапаў без вестак у выніку надзвычай моцнай паводкі на захадзе Украіны. Амаль 300 населеных пунктаў і 10 тысяч дамоў падтоплены, знішчана больш за 110 кіламетраў аўтадарог і 64 масты, паведаміла Дзяржаўная служба па надзвычайных сітуацыях. Прэм'ер-міністр і кіраўнік МУС вылецелі ў Прыкарпацце для каардынацыі работ па пераадоленні наступстваў стыхіі. «Фактычна маштабы паводкі перавышаюць узровень тых, што мы бачылі ў 2008 годзе, — заявіў прэм'ер Дзяніс Шмыгаль. — Цяпер у горадзе Галічы затопленая раённая бальніца, ідзе эвакуацыя пацыентаў. Пэўныя цяжкасці звязаны з тым, што там ёсць хворыя на COVID-19». Больш за ўсё пацярпелі Івана-Франкоўская і Чарнавіцкая вобласці, дзе з панядзелка ўведзеныя надзвычайныя меры бяспекі. Закрануты таксама Львоўская, Цярнопальская і Закарпацкая вобласці.

Танзанійскі старацель знайшоў рэдкія крышталі і стаў мільянерам

Прыватны капальнік Санінью Лейзер атрымаў ад міністэрства горнай прамысловасці Танзаніі 3,4 мільёна долараў за два знойдзеныя ім крышталі танзаніту агульнай вагой 15 кілаграмаў. Гэты каштоўны камень здабываецца толькі на рудніку Мерэлані на поўначы Танзаніі і выкарыстоўваецца для вырабу ўпрыгажэнняў. Танзаніт — адзін з самых рэдкіх самацветаў на Зямлі. Ён бывае зялёны, чырвоны, барвовы, але часцей за ўсё — сіні. Кошт канкрэтнага каменя залежыць ад чысціні і празрыстасці. 52-гадовы Лейзер адкапаў крышталі вагой 9,2 і 5,8 кілаграма на мінулым тыдні, а прадаў уладам днямі на гандлёвай сесіі ў Маньяры. Дагэтуль самы вялікі крышталь танзаніту, знойдзены ў Танзаніі, важыў 3,3 кілаграма. Прэзідэнт краіны Джон Магуфулі патэлефанаваў шчасліўчыку і павіншаваў яго. «Мы бачым, наколькі багатая Танзанія і якую карысць прыносяць вольныя старацелі», — заявіў прэзідэнт.

На слыху

НЕЗАПЛАНАВАНАЯ СМАГА

Што адбываецца з вадой у сталіцы?

24 чэрвеня ў Фрунзенскім і Маскоўскім раёнах Мінска з кранаў пайшла вада з моцным непрыемным пахам. Нехта казаў, што гэта аміяк, нехта — што сцёкавыя воды, іншыя мінчане падбіралі больш яркія эпітэты. Учора на брыфінгу аб сітуацыі з водазабеспячэннем у Мінску была дадзена афіцыйная ацэнка таго, што здарылася.

Перш за ўсё — пра самае важнае. У вадзе з непрыемным пахам, якая ўчора стала паступаць у разводзячую сетку Фрунзенскага і Маскоўскага раёнаў, патагеннай мікрафлоры не знойдзена. Але піць яе пакуль што не трэба.

— Адразу ж пасля паступлення першай інфармацыі пра ваду, якая трапляе ў разводзячую сетку і мае непрыемны пах, быў арганізаваны адбор проб. Пробы былі ўзятыя перш за ўсё па тых адрасах, адкуль паступалі тэлефонныя званкі, а таксама з аб'ектаў, якія размешчаны ў зоне ўплыву сістэмы водазабеспячэння Фрунзенскага і Маскоўскага раёнаў, — расказала **намеснік міністра аховы здароўя, галоўны санітарны ўрач Наталля ЖУКАВА.**

Паводле слоў спецыяліста, гэты маніторынг ажыццяўляўся на працягу ўсяго пазаўчарашняга дня і працягваўся ўчора. Лабараторыя Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі працуе ў кругласутачным рэжыме. Даследаванні вады праводзяцца ў тры этапы. Перш за ўсё аператыўна высвятляецца яе адпаведнасць устаноўленым нормам па арганалептычных паказчыках. Другі этап — ацэнка фізіка-хімічных адзнак вады. Трэці — даследаванні па паказчыках мікрабіялагічных і вірусалагічных.

— Мы вызначылі, што вада не адпавядае нормам па паху і шэрагу фізіка-хімічных нарматываў. Галоўным санітарным урачом Мінска было прынята рашэнне аб забароне выкарыстання гэтай вады для пітва. Сёння мы можам казаць, што нармалізаваліся паказчыкі перш за ўсё арганалептычныя, фізіка-хімічныя — нармалізуюцца. І ёсць першыя звесткі аб тым, што па мікрабіялагічных адзнаках вада адпавядае ўстаноўленым патрабаванням. Патагеннай мікрафлоры ў ёй знойдзена не было. Але даследаванні працягваюцца, — падкрэсліла Наталля Жукава.

Галоўны санітарны ўрач рэкамендуе жыхарам Фрунзенскага і Маскоўскага раёнаў устрымацца ад ужывання вады з-пад крана для піцця і прыгатавання ежы, пакуль не будзе дакладна ўстаноўлена, што вада ў разводзячай сетцы цалкам адпавядае патрабаванням па ўсіх паказчыках, зацверджаных нарматыўнымі дакументамі.

— Для гэтага спецыялістамі УП «Мінскводаканал» прымаецца комплекс мер, а мы працягваем кантроль якасці і бяспекі вады ў разводзячай сетцы не толькі на тэрыторыі Фрунзенскага і Маскоўскага раёнаў, але і ў Ленінскім, Цэнтральным і Кастрычніцкім раёнах Мінска — у зоне памежнага ўплыву водазабору. Работа будзе працягвацца да поўнай нармалізацыі сітуацыі, — падкрэсліла Наталля Жукава.

Забараняць выкарыстоўваць ваду, якая не вельмі добра пахне, для бытавых мэт, не звязаных з піццём і гатаваннем ежы, няма падстаў, сказала галоўны санітарны ўрач.

Плаціць за няякасную ваду не давядзецца

Створана рабочая група па аб'ектыўным і ўсебаковым расследаванні прычын пагаршэння якасці пітной вады ў Маскоўскім і Фрунзенскім раёнах.

— Нас, безумоўна, турбуе гэтая сітуацыя, мы маем намер старанна расследаваць прычыны таго, што адбылося, і зрабіць адпаведныя вывады, каб не дапусціць у будучым падобных выпадкаў, — сказаў **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр ДАРАХОВІЧ.**

Спецыяліст падкрэсліў, што, па аператыўнай інфармацыі, па стане на 12.00 25 чэрвеня 111 дамоў у Фрунзенскім і Маскоўскім раёнах сталіцы ўжо атрымліваюць ваду, якая не мае паху і іншых адхіленняў.

— Работа вядзецца, іншыя раёны дапамагаюць Маскоўскаму і Фрунзенскаму, каб аператыўна вырашыць гэтую праблему, — сказаў Аляксандр Дараховіч. — На магістральных і ўнутрыквартальных сетках работы ўжо праведзены. Мы кажам жыхарам гэтых двух раёнаў праз СМІ і асабіста: неабходна зліць стаякі і тое, што знаходзіцца ў кранах. Чым хутчэй мы гэта зробім, тым хутчэй мы атрымаем якасную ваду.

Баяцца, што давядзецца плаціць за няякасную ваду, не трэба, падкрэсліў Аляксандр Дараховіч. Будзе зроблены перараслік, і плата за гэтую ваду брацца не будзе.

Тэрмін вырашэння праблемы «Водаканал» не называе

Аварыйныя сітуацыі, звязаныя з водазабеспячэннем, бывалі і ў ранейшыя гады. Але такой маштабнай праблемы, якая закранала б два раёны Мінска, яшчэ не было, адзначыла Наталля Жукава.

— Ніякіх аварый, якія маглі б выклікаць такую сітуацыю, мы не фіксавалі. Прыцягнута шырокае кола спецыялістаў, каб выявіць прычыну, — сказаў **дырэктар УП «Мінскводаканал» Алег АЎРУЦІН.**

Ён адзначыў, што ёсць інфармацыя пра адзінкавыя выпадкі пагаршэння якасці вады ў сумежных з пацярпелымі раёнах сталіцы. Цяпер там таксама працуюць спецыялісты.

Дакладныя тэрміны, калі ў дамы мінчан пачне паступаць якасная вада, дырэктар Мінскводаканал не назваў. Аднак запэўніў, што спецыялісты разлічваюць на хуткае паляпшэнне сітуацыі. Ужо ўчора раніцай у больш чым 100 дамах Фрунзенскага раёна халодная вада адпавядала норме. Наогул жа няякасную ваду пазаўчора атрымалі 1400 дамоў Фрунзенскага раёна і 860 дамоў Маскоўскага.

Што піць, пакуль усё не наладзіцца

Арганізаваны падвоз пітной вады да жылых дамоў, у дзіцячыя і медыцынскія ўстановы Фрунзенскага і Маскоўскага раёнаў.

— У нас ёсць спіс такіх аб'ектаў. У прыватнасці, пачынаючы з 4.00 раніцы Мінскводаканал даставіў у сярэднім каля 300 літраў чыстай якаснай вады кожнаму дзіцячаму садку, — расказаў Аляксандр Дараховіч. — Наладжана ўзаемадзеянне з адміністрацыямі раёнаў, і вада падвозіцца туды, дзе ўзнікае дадатковая патрэба.

Для забеспячэння якаснай вадой насельніцтва жылых дамоў прыцягнута сем адзінак тэхнікі Міністэрства абароны, а ўчора ў 14.00 вайскоўцы далі мінчанам яшчэ чатыры цыстэрны. Дапамогу ў падвозе вады насельніцтву аказалі найбуйнейшыя прадпрыемствы сталіцы — «Малочны гасцінец», «Мінсккрыстал», Мінскі холадакамбінат № 2, «Кока-кола», «Дарыда», Мінскі завод безалкагольных напояў. Учора для забеспячэння якаснай вадой насельніцтва пацярпелых раёнаў былі задзейнічаны 25 цыстэрнаў, яшчэ чатыры чакаюцца з Вілейкі, Слуцка і Жодзіна. Акрамя таго, у Фрунзенскім раёне працуюць тры дэкаратыўныя крыніцы з артэзіянскай вадой.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

❍ У тэму

Сітуацыя пад кантролем

Прэм'ер-міністр азнаёміўся з сітуацыяй па забеспячэнні чыстай вадой жыхароў Фрунзенскага раёна Мінска

Раман Галоўчанка высветліў, як арганізаваны падвоз чыстай пітной вады насельніцтву, ці забяспечана яе наяўнасць у гандлёвых сетках і сацыяльных установах.

У цяперашні час дадзены аператыўныя даручэнні па тэрміновай перакідцы дадатковых машын з пітной вадой з іншых рэгіёнаў.

«Па даручэнні прэм'ер-міністра МАРГ праводзіць аператыўную сустрэчу з прадстаўнікамі гандлю і вытворцаў па пытаннях павелічэння аб'ёмаў паставак пітной вады і недапушчэнні росту цэн у сувязі з павышаным попытам на яе», — паведамляе прэс-служба ўрада.

Распараджэннем прэм'ер-міністра таксама створана міжведамасная рабочая група для ацэнкі сітуацыі з пападаннем няякаснай вады ў сістэму водазабеспячэння, дзеянняў службовых асоб і выпрацоўкі мер па недапушчэнні падобнай сітуацыі ў будучым.

Раман Галоўчанка праверыў, як забяспечаны вадой сацыяльныя ўстановы, і наведаў дзіцячы яслі-сад № 76.

«У цэлым сітуацыя пад кантролем. У прычынах таго, што адбылося, разбіраюцца кампетэнтныя службы», — рэзюмавала прэс-служба Саўміна.

«КІНА НЕ БУДЗЕ?»

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Так, мы зрабілі пэўныя захады для бяспекі супрацоўнікаў і наведвальнікаў, — ловіць мой позірк упраўляючы, — паўсюль, дзе можна, праводзім дэзынфекцыю, вызначылі максімальную колькасць гледачоў не больш чым 25 % ад напаўняльнасці залы. Але не зачыняліся ні на адзін дзень, і на сёння я ўпэўнены, што выбралі правільны шлях. Я бачу гэта нават па рэакцыі 38 тысяч удзельнікаў нашай суполкі «ВКонтакте»: некаторыя адмовіліся ад наведвання публічных месцаў, але многія працягвалі хадзіць, цікавіліся рэпертуарам, акцыямі. Канешне, тут паўстала галоўная праблема, што не было фільмаў, але яна датычылася ўсяго свету — калі абвешчаныя рэлізы пераносяцца і прэм'еры адкладваюцца, што тут зробіш, акрамя таго што будзеш чакаць? Мы выйшлі з сітуацыі дзякуючы старым фільмам, перабіраць не выпадала: выбіралі з таго, што маглі ўзяць у абласным кінапракаце — там засталося каля 40 фільмаў, тэрмін правоў на паказ якіх яшчэ не скончыўся, альбо ў расійскіх дыстрыб'ютараў, якія не сышлі ў спячку».

Самы цяжкі і «пусты», кажа ўпраўляючы, быў май, калі на сеансы прыходзілі лічаныя гледачы. «Але мы загадзя рыхтаваліся, разумелі, што два-тры месяцы нічога добрага не будзе і трэба проста перацярпець. На тое, як я сябе паводжу, глядзяць усе — ад дырэктара да прыбіральшчыц: ці панікую я, ці захоўваю спакой. Калі б зачыніліся, то ў вымушаным адпачынку разам з дзяўчатамі-дэкрэтніцамі аказалася б каля 70 чалавек. А так 8 ці 9 чалавек, скажам, з бараў сышлі працаваць па спецыяльнасці, і мяне гэта ў прынцыпе радуе».

Цікавімся, што карыстаецца найбольшым попытам у кінаманаў Баранавіч — мо, камедыі, якія дазваляюць адпачыць ад тэмы пандэміі? «А вось і не, — усміхаецца **дырэктар «Звезды» Ягор МЯЦЕЎ,** — фільмы жахаў, і толькі потым камедыі».

Каб крыху разварушыць публіку, уключылі ў рэпертуар некалькі адносна новых фільмаў і кінахітоў ад Дыснея, Universal Pictures ды іншых вядучых кінакампаній. А ў пачатку чэрвеня прыдумалі акцыю «Выберы першым»: кожны ахвотны, хто першым збірае кампанію сяброў і набывае мінімум пяць білетаў, можа выбраць са спісу кінастужак і мультфільмаў 6+, што жадае паглядзець сёння ўвечары, а астатнія гледачы могуць альбо пагадзіцца з выбарам і далучыцца да прагляду, альбо выбраць першымі свой любімы фільм у наступны дзень. Яшчэ адна ідэя, якая пайшла на «ўра», — «Дамашні кінатэатр», у якім можна арандаваць залу на дзве гадзіны і больш, каб паглядзець на вялікім экране свае любімыя фільмы (у тым ліку па інтэрнэт-падпісцы), відэазапісы альбо фота.

— Прыходзілі нават удваіх, каб перагледзець, напрыклад, кадры 20-гадовай даўніны з уласнага вяселля, — дзеліцца Уладзімір Боўфалік. — І тут справа не ў тым, што ў людзей няма дома тэлевізара ці камп'ютара з вялікім маніторам, а ў тым, каб змяніць абстаноўку, збегчы ад мітусні і пабыць сам-насам з каханым чалавекам або сябрамі. Хоць і сучасны экран, і якасны гук, безумоўна, таксама маюць значэнне.

— Да таго ж за спінай ніхто не шамаціць абгорткамі ад чыпсаў, — як глядач вар'яцею ад такіх непажаданых «спецэфектаў»...

— А ў нас такога і няма, — запэўнівае дырэктар «Звезды». — Мы забаранілі ўваход у кіназалы з пакетамі, якія шамацяць, — чыпсы прадаём толькі ў куфэрках ад папкорну. Спачатку многія былі супраць, а потым прызвычаіліся і нават дзякуюць.

— Паўсюдна змяняецца сама бізнес-мадэль кінатэатра, — разважае Уладзімір Боўфалік. — Асабліва гэта відаць у нас, на перыферыі. Калі ў Мінску і вялікі выбар залаў, і хутчэйшы рытм самога гарадскога жыцця, то ў нас такога няма, і людзей трэба наноў прывучаць хадзіць у кіно. Калі мы толькі адкрыліся, то сумесна з гарадскімі ўладамі забаранілі на час першых паказаў продаж касет і дыскаў з тымі фільмамі, якія ішлі ў гарадскіх кінатэатрах, і яшчэ каля года самі даціравалі, ладзілі нават бясплатныя паказы, каб проста прывучыць людзей з дому глядзець кіно. Многа робім бясплатных сеансаў, якія прыцягваюць пажылых людзей, дый мне самому цікава, як будзе змяняцца аўдыторыя. Гэта як у сацсетках: трэба знайсці «сваіх» людзей, з якімі будзе цікава стасавацца, і прапаноўваць розны кантэнт. Адзін з эксперыментаў, які таксама хачу здзейсніць, — «сеанс-сюрпрыз»: білет будзе каштаваць усяго адзін рубель, але вы не ведаеце, які фільм будзеце глядзець, — беларускае кіно, ці дакументальнае, а мо, рэтрафільм... А ў перспектыве, мяркую, кінатэатр павінен ператварыцца ў цэнтр, дзе будуць праходзіць самыя розныя мерапрыемствы, у тым ліку бясплатныя, творчыя сустрэчы для шырокай публікі, ад дзетак да дзядоў.

— Дарэчы, ці запатрабавана ў вас беларускае кіно?

— Бяром яго, але, на жаль, глядзяць не вельмі актыўна. І тут мы зноў вяртаемся да таго, што трэба арыентавацца на публіку: калі ёсць запыт на старыя фільмы, ці канцэрты, ці айчыннае кіно, ці на фільмы на замежных мовах (польскай, нямецкай, англійскай, французскай — моладзь часта так вучыць мову) — яго трэба даваць. Таму беларускую навінку «Авантуры Пранціша Вырвіча», калі яе нарэшце выпусцяць у пракат, абавязкова пакажам.

— Якія фільмы, на ваш погляд, варта паглядзець альбо перагледзець гэтым летам?

— Ва ўсіх розныя густы, таму пераіць нешта адно немагчыма. За нас магу сказаць, што фільм «Джэнтльмены», які мы, дарэчы, паказалі першыя ў вобласці, «працаваў» амаль тры месяцы — вельмі якасная, добра знятая і сыграная стужка. Наогул, варта часцей хадзіць у кіно і глядзець розныя фільмы.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Баранавічы—Мінск.

ЛІШНІ? ЦІ НЕ ЛІШНІ?

...Першы раз убачыўшы яе, такую кволую, па-дзіцячы нязграбную, безабаронную, Кірыл падумаў, што вось яно — ягонае шчасце! Кветкі насіў, з надзеяй зазіраў у вочы і знайшоў-такі адказ на сваё пытанне: яны згулялі вяселле.

Як быццам нядрэнна жылі, разам гадавалі першынца, аднак на жыццёвым шляху мужчыны сустрэлася іншая. Ёй, працуючы поруч, пад бокам, можна сказаць, няцяжка было знайсці падыход і патрэбныя словы, завалодаць увагай, а ўрэшце ўзяць ды разбурыць тое, што толькі-толькі пачало будавацца — Кірылаву першую сям'ю.

...Праўда, і ў другой ні ён, ні тая шалахвостка-разлучніца шчасця не знайшлі. Таму зноў развод, пасля якога мужчына доўга заставаўся адзін — не хацеў, баяўся памыліцца яшчэ раз.

А Таню ён ведаў даўно, лічыў яе добрым, надзейным сябрам. Адкуль узялося каханне, прычым раптам — ні села ні пала — ніхто не зразумеў.

Але ж сталі сустракацца, разам бавіць час, строіць жыццёвыя планы. Адзінае — тайком, каб не сурочыць. Да таго ж у Тацяны — немаленькая дачка. Раптам не прыме новага чалавека, не адобрыць выбар матулі?

Дарэмна яны баяліся: з дачкой, дзякаваць богу, праблем не было. Супраць новага чалавека паўстала хіба што... кошка. І шкодзіла яна як толькі магла — то ў туфлі Кірылу нагадзіць, то падушку яго памеціць...

Спроба нечым падкупіць ці дамовіцца поспеху не мела. Першыя папярэджанні — разам з падушкай скінуць яе з пятага паверха — на жаль, таксама. Тады Кірыл ёй вынес апошняе, чамусьці кажуць кітайскае...

У тую ноч яго моцна мучыла смага. Уключыў святло, каб не наступіць (кошка мела звычку спаць на дыванку каля ложка), насунуў тэпці, пашыбаваў у кухню. Праз некалькі хвілін вярнуўся і як не знямеў: на прасціне, дзе толькі што спаў, шарэла свежая пляма. Кошка, зрабіўшы яе, куляй сіганула за канапу.

— Ну ўсё! — закрычаў Кірыл, памкнуўшыся лавіць злачынцу. — Далей так працягвацца не можа! Нехта з нас лішні: ці я, ці яна!

— Пастой... Пацярпі яшчэ трошкі, — са слязьмі на вачах стала прасіць Таццяна. — Я сама паспрабую... Я з ёй пагавару — апошні раз...

Што ў іх была за «размова», ніхто не ведае. Можа, адна адной «расказалі» пра свае пачуцці, можа, паскардзіліся на лёс, можа, абмеркавалі далейшыя перспектывы... Аднак з таго часу кошку як падмянілі: цяпер, нейкім чынам адчуваючы Кірылаў прыход, яна загадзя садзіцца каля дзвярэй — чакае, следам за гаспадаром (прызнала!) ходзіць на балкон «пакурыць» і ноччу аддана сцеражэ яго адпачынак... А каб нашкодзіць? Ды ніколі! Ні-ні!

Галіна Нічыпаровіч,
Уздзенскі раён.

P.S. *Не ведаю, наколькі смешная гэта гісторыя, але ж праўдзівая. І пра ўсе Кірылавы жаніцьбы я расказала спецыяльна, каб падзяліцца адным балючым назіраннем. Раней людзі стваралі сем'і і жылі. Не без таго — часам спрачаліся, моцна сварыліся, злавалі адно на аднаго, але ж потым мірыліся, разам гадавалі дзяцей, чакалі ўнукаў. Цяпер жа — час нейкага легкадумства: можна сыходзіцца і разыходзіцца з-за драбязы альбо дзеля нейкіх сумнеўных прыгод...*

Альбо нават з-за кошкі.

А МОРА Ў КОЖНАГА СВАЁ

На пачатку года ў працоўных калектывах складаюцца графікі адпачынкаў. Шмат каму хацелася б мець іх улетку, каб пабыць разам з дзецьмі, праведаць родзічаў, рвануць да мора, калі ёсць такая магчымасць...

У тым годзе ў маёй знаёмай яе не было: дачка развітвалася са школай, паступала вучыцца далей. Хіба маці тады да нейкіх паездак?.. Аднак, нягледзячы на гэта, з водпуску яна вярнулася з такім шыкоўным загарам...

— Дзе была? Адкуль? — здзівіліся жанчыны.

— З зялёнага мора, — усміхнулася яна.

— Гэта дзе ж такое знаходзіцца? Чорнае — зразумела, Белае з Чырвоным — таксама, а пра Зялёнае мы нават не чулі.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **28.07.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.07.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 8 (029) 102-21-17.
Контактный телефон для осмотра: +375 44 475 21 11

УНП 600123313

УНН 190431606

УП «Белконфискат»
обьявляет о проведении электронных торгов 17.07.2020 г. по продаже легкового вагона Ситникова А. Ю.:
«Fiat Ducato», 1992 г. в.,
начальной стоимостью 664 рубля.

На сайте **belkonfiskat.by** размещена информация о порядке проведения торгов, справки по тел. 8 (017) 3639489, 8 (029) 7790809.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ГУ «Минская областная государственная инспекция по семеноводству, карантину и защите растений» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ, НАИМЕНОВАНИЕ – ОФИСНОЕ ПОМЕЩЕНИЕ С ЛОДЖИЕЙ,
инв. № 644/D-29678, общая площадь 54 кв. м, расположенного по адресу:
Минская обл., г. Солигорск, ул. Богомолова, 22-44

Срок договора аренды	3 года
Начальная цена права заключения договора аренды, бел. руб.	240,98
Сумма задатка, бел. руб.	24,09
Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта	722,93 (без учета повышающих либо понижающих коэффициентов)

Базовая арендная величина с 01.04.2020 составляет 17,85 бел. руб. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта, перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства. Аукцион состоится **27.07.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.07.2020** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 8 (029) 102-21-17,
сайт в сети интернет: www.rlt.by.

УНН 190443590



СКАНВОРД

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Каскад. Сто. Качар. Джэм. Нарыс. Лапа. Удава. Адам. Бок. Ніл. Карэ. Раса. Слуп. Пласт. Сода. Агарак. Молат. Кара. **Па вертыкалі:** Касір. Дрозд. Адна. Атрад. Жолаб. Мацак. Апала. Сум. Ворс. Атэстат. Ікол. Прусак. Апора. Атака. Ауп. Дар.

Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.39	21.46	17.07
Віцебск —	4.20	21.44	17.24
Магілёў —	4.29	21.36	17.07
Гомель —	4.35	21.23	16.48
Гродна —	4.56	21.59	17.03
Брэст —	5.06	21.50	16.44

Месяц

Маладзік 21 чэрвеня. Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Акуліны, Антаніны, Ганны, Пелагеі, Дзмітрыя, Івана, Савы.*
К. *Дануты, Магдалены, Паўліны, Паўла, Рудольфа, Яна.*

Фота Вікторыі МІРОНЧЫК.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

26 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1945 год — Беларуская ССР разам з іншымі дзяржавамі антыгітлераўскай кааліцыі — заснавальнікамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый падпісала Статут ААН (ратыфікаваны Вярхоўным Саветам БССР 30 жніўня 1945 года).

1955 год — нарадзілася Галіна Васілеўна Забур'янава, беларуская спартсменка (плаванне), майстар спорту СССР, суддзя нацыянальнай катэгорыі. Чэмпіёнка першынства СССР (1971), фіналістка Спартакіяды народаў СССР (1975). Прызёр Кубка СССР (1975). Неаднаразовая чэмпіёнка Беларусі і Расіі.

1970 год — нарадзілася Марына Вікенцьеўна Лобач, беларуская спартсменка (мастацкая гімнастыка), заслужаны майстар спорту СССР, суддзя міжнароднай катэгорыі. Абсалютная чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў 1988 года, чэмпіёнка (1987) і сярэбраны прызёр (1985) чэмпіянатаў свету ў асобных відах мнагаборства. Чэмпіёнка Еўропы (1988) і сярэбраны прызёр у асобных відах практыкаванняў.

У свеце

1925 год — нарадзіўся Павел Іванавіч Бяляеў, лётчык-касманаўт СССР, Герой Савецкага Саюза. Камандзір касмічнага карабля-спадарожніка «Узыход-2», з борта якога 18 сакавіка 1965 года лётчык-касманаўт Аляксей Лявонаў здзейсніў першы ў свеце выхад у адкрытую касмічную прастору.

1940 год — Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прыняў Указ «Аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага сыходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў». Прадугледжвалася павелічэнне працягласці рабочага дня. Забараняўся самавольны пераход рабочых і служачых з аднаго прадпрыемства на іншае, парушальнікі аддаваліся суду і караліся турэмным зняволеннем. Прагул без уважлівай прычыны цягнуў папраўча-працоўныя работы па месцы працы на тэрмін да шасці месяцаў з утрыманнем чвэрці заробку.

1945 год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР устаноўлена воінскае званне Генералісімус Савецкага Саюза. На наступны дзень першым і адзіным яго ўладальнікам стаў Іосіф Сталін.

У гэты ж дзень быў заснаваны Міжнародны суд, галоўны судовы орган ААН.

1950 год — нарадзіўся Яак Арнавіч Ёала, савецкі і эстонскі эстрадны спявак. Заслужаны артыст Эстонскай ССР.

1960 год — абвешчана незалежнасць Мадагаскара.

Так гаварыў...

ЛЕЎ ТАЛСТОЙ:

«У таго, хто нічога не робіць, заўжды шмат памагатых».

УСМІХНЕМСЯ

Доктар звычайнай сельскай бальніцы знайшоў цудатворны сродак ад усіх жаночых хвароб — варта сказаць жанчыне, што гэта звычайная прыкмета старасці, і выздараўленне адбываецца проста на вачах...

Фраза доктара: «Да вясельля зажыве!» — моцна здзівіла 80-гадовую бабульку, але запаліла бляск у яе вачах!

— Увечары, ідучы спаць, вам варта пакідаць за дзвярыма ўсе свае непрыемнасці, — раіць псіхатэрапеўт свайму пацыенту.

— І вы думаеце, — кажа пацыент, — што мая жонка пагодзіцца спаць на лесвічнай пляцоўцы?

— Доктар, гэта праўда, што жанчыны жывуць даўжэй за мужчын?

— Ва ўсялякім выпадку, удовы...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1854. Нумар падпісаны ў 19.30 25 чэрвеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

26 чэрвеня 2020 г. № 24 (560)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

ПАБУДАВАНА Ў БЕЛАРУСІ

Фота Аляксандра ПУКШАНСКАГА.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Па традыцыі да Дня Незалежнасці па ўсёй краіне рыхтуюцца да адкрыцця значныя аб'екты. Мы падгледзелі якія

На Гомельшчыне чакаюць маленькіх навасёлаў у дзіцячым садку ў Петрыкаве. На Гродзеншчыне аматары спорту атрымаюць у падарунак шматфункцыянальны спартыўны комплекс «Лідар», што адкрыецца ў Навагрудку. Жыхары Пухавіцкага раёна, што на Міншчыне, таксама будуць задаволеныя з нагоды адкрыцця фізкультурна-аздараўленчага цэнтра, якога чакалі даўно. А ў віцебскім мікраёне новабудоўляў Білева з'явіцца новая школа з двума басейнамі і ліфтам! У сталіцы ж чакаюць па-сапраўднаму летняга адкрыцця: у акваторыі ракі Свіслач «расквітнее» святломузычны фантан з унікальным шоу. Ён, дарэчы, выкананы ў форме прамавугольніка даўжынёй 90 і шырынёй 16 метраў. Водную феерыю ствараюць каля 200 струменяў, якія падымаюцца на вышыню да 30 метраў. Комплекс аснашчаны відэапраектарам і лазернай сістэмай для таго, каб праецыраваць выяву на водную паверхню.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на стар. 4–14

Сяргей РАЧКОЎ:

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

«Час экспарцёрам скарыстацца «акном новых магчымасцяў»

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў расказаў аб звязаных з пандэміяй эканамічных наступствах і шляхах іх мінімізацыі для арыентаваных на экспарт прадпрыемстваў, ролі Савета Рэспублікі і мясцовых органаў улады ў садзейнічанні стварэнню новых высокатэхналагічных прадуктаў, брэндаў, далейшай дыверсіфікацыі беларускага экспарту ў свеце, як па наменклатуры тавараў, так і па яго геаграфіі.

— Наколькі рэальныя, вартыя ўвагі прагнозы і высновы наконт чарговага глабальнага крызісу. Маўляў, мы зноў апынуліся перад пагрозай як у 2008—2009 гадах. Такія размовы маюць пад сабой глебу ці гэта «страшылкі» экстравагантных эканамістаў і палітолагаў?

— Сусветныя эканамічныя крызісы адбываюцца нярэдка, іх частата і перыядычнасць абумоўлены многімі фактарамі. Не заўсёды яны выкліканы фінансава-эканамічнымі прычынамі, як, напрыклад, крызіс 2008—2009 гадоў. Як правіла, з улікам узроўню развіцця сучаснай эканамічнай навукі і інфармацыйных тэхналогій шматлікія крызісныя эканамічныя з'явы можна з пэўнай ступенню верагоднасці прадбачыць і пралічыць.

Цяпер відавочна, што пандэмія каранавіруснай інфекцыі становіцца каталізатарам новага глабальнага эканамічнага крызісу, які ў цэлым стаў нечаканым для ўсіх краін свету і пакуль складана прагназаваным па сваіх наступствах. Гэты крызіс супаў і з часткова таксама справакаваным сур'ёзным крызісам нафтавага рынку.

стар. 3

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Драйверы росту

Савет па ўстойлівым развіцці прайшоў у фармаце відэаканферэнцыі. стар. 2

З аўтаномным ходам...

Маршрут бескантактавых тралейбусаў у Гродне падоўжаць удвая. стар. 4

Экзоты ў нашых умовах

Айву японскую і актынідыю вырошчваюць на Брэстчыне. Больш у Беларусі іх не сустрэнеш нідзе. стар. 14

«Старшыя» па вёсцы



На што здатныя «рухавікі» актыўнай грамадскай пазіцыі — старэйшыны і памочнікі старшынь сельсаветаў Гомельскага раёна? стар. 15

Упрыгожылі разам

Жыхары Краснаполля, што на Магілёўшчыне, далучыліся да рэспубліканскай акцыі па добраўпарадкаванні. стар. 16

НА ШЛЯХУ ДА МЭТ

ДРАЙВЕРЫ РОСТУ

Савет па ўстойлівым развіцці прайшоў у фармаце відэаканферэнцыі

Яго ўдзельнікі — члены згаданага Савета, прадстаўнікі парламенцкай і партнёрскіх груп, міжнародныя партнёры — абмеркавалі работу, што праводзіцца ў краіне, па дасягненні Мэт устойлівага развіцця (МУР) і вызначылі план дзеянняў на 2020—2021 гады.

— У краіне створаны эфектыўны механізм для дасягнення МУР — нацыянальная архітэктура кіравання, — упэўнены **віцэ-спікер Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па Мэтах устойлівага развіцця Анатоль ІСАЧАНКА.** — Дзейнасць Савета стварае платформу для абмену поглядамі і абмеркавання вынікаў і складаецца з чатырох асноўных кірункаў: эканамічнага, сацыяльнага, экалагічнага, маніторынгу і ацэнкі дзейнасці па дасягненні Мэт.

Ён паведаміў, што на працягу года асноўная ўвага ў дзейнасці па дасягненні МУР была аддадзена рабоце над праектам Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Беларусі на перыяд да 2035 года (НСУР-2035). Аднак эпідэміялагічная сітуацыя, што склалася ў свеце, патрабуе адпаведных карэкціровак і на нацыянальным узроўні. У сувязі з гэтым узнікла неабходнасць дапрацоўкі праекта праграмы НСУР і змен у ёй у адпаведнасці з глабальнымі выклікамі, растлумачыў Анатоль Ісачанка. Гэтым зараз займаецца Мінэканомікі, і нацыянальны каардынатар па МУР прапанаваў удзельнікам актыўна падключыцца да работы.

— Праект НСУР-2035 стане фундаментальнай базай для падрыхтоўкі стратэгій, праграм і планаў развіцця галін і рэгіёнаў, — звярнуў увагу ён. — Менавіта работа па рэгіянальным развіцці павінна стаць прыярытэтам, а яе асноўнымі драйверамі будуць выступаць спецыялізацыя, комплекснасць, ініцыятыва і супрацоўніцтва.

Нацыянальны каардынатар упэўнены, што неабходна актывізаваць дзейнасць рэгіянальных груп, у тым ліку па распрацоўцы планаў і стратэгій рэгіянальнага развіцця, у аснове якіх будуць стварэнне роўных магчымасцяў для жыцця насельніцтва незалежна ад рэгіёна краіны і месца жыхарства.

— Таму я папрашу прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў зрабіць канкрэтныя прапановы ў план работы Савета па ўстойлівым развіцці на наступны год, — акцэнтаваў увагу Анатоль Ісачанка.

Дарэчы, вынікам сумеснай работы Савета па ўстойлівым развіцці, урада, Нацыянальнага сходу, партнёрскай групы, міжнародных партнёраў з'яўляецца тое, што сёння наша краіна займае лідарскія пазіцыі па дзейнасці на нацыянальным узроўні па выкананні Парадку дня — 2030. Трэба сказаць, што летась у рэйтынгу Індэкса дасягнення глабальных мэт устойлівага развіця Беларусь займала 23 месца са 162 дзяржаў. З удзелам міжнародных арганізацый быў праведзены цэлы шэраг мерапрыемстваў на нацыянальным і міжнародным узроўнях. Аднак распаўсюджанне каранавіруснай інфекцыі не магло не адбіцца на бягучых планах: так, у сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй адменены запланаваны Форум Еўразійскага эканамічнага саюза па пытаннях дасягнення МУР, а таксама Тыдзень устойлівага развіцця.

> Менавіта работа па рэгіянальным развіцці павінна стаць прыярытэтам, а яе асноўнымі драйверамі будуць выступаць спецыялізацыя, комплекснасць, ініцыятыва і супрацоўніцтва.

— У такіх умовах увага была сфакусавана на ўзаемадзеянні з міжнароднымі партнёрамі па прыцягненні дадатковай падтрымкі для барацьбы з COVID-19. Частка сродкаў праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі была накіравана на набыццё медыцынскіх вырабаў, — растлумачыў Анатоль Ісачанка.

Её падзякаваў партнёрам за падпісанне новага праекта па падтрымцы функцыянавання архітэктуры кіравання працэсам дасягнення МУР. Гэта дазволіць актывізаваць работу ў другім паўгоддзі ў тым жа тэмпе і з такім жа прагрэсам, які дасягнуты на цяперашні момант.

Між іншым, нацыянальны каардынатар упэўнены, што вынікам дзейнасці павінны быць не толькі паказчыкі і рэйтынгі, але ў першую чаргу ацэнка гэтай работы з боку насельніцтва краіны. Для гэтага, лічыць ён, трэба актывізаваць намаганні па інфармаванні людзей аб тэматыцы МУР. У прыватнасці, у хуткім часе на тэлеканалах з'явіцца тэматычны відэаролік, таксама ў стадыі распрацоўкі новыя білборды, якія раскажуць асобна аб кожнай з Мэт. Нагадаем, іх — 17. Ёсць і іншыя прапановы ў гэтым кірунку.

— Архітэктура кіравання створана, цяпер нам неабходна сканцэнтравацца на практычным аспекце, — рэзюмаваў віцэ-спікер Савета Рэспублікі.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

НА ПАРАДКУ ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА:

«АСАБІСТЫЯ СУСТРЭЧЫ З ЛЮДЗЬМІ ДАПАМАГАЮЦЬ ЛЕПШ ДАВЕДАЦЦА, ЧЫМ ЖЫВУЦЬ РЭГІЁНЫ»

Спікер верхняй палаты парламента працягвае наведваць рэгіёны. У канцы мінулага тыдня ў рабочым графіку значыўся Пінск, а бягучы яна пачала з наведвання Ліды. У абодвух выпадках старшыня Савета Рэспублікі наведвала знакавыя прадпрыемствы з катэгорыі горадаўтваральных, брэндаў краіны, знаёмілася з іх работай, перспектывамі развіцця і сустракалася з калектывамі.

У Пінску Наталля Качанава азнаёмілася з вытворчасцю мэблі ў СТАА «Пінскдрэў-Адрыяна» — гэта адна з чатырох мэблевых фабрык холдынга. Звычайна за дзень тут вырабляюць да 270 адзінак прадукцыі, за месяц — на 7–7,5 мільёна рублёў. Апошнім часам узніклі цяжкасці з выхадам на знешнія рынкі з-за пандэміі COVID-19, таму аб'ёмы вытворчасці знізіліся. Але ўжо з наступнага месяца ўсе прадпрыемствы холдынга пераходзяць на поўны рэжым работы.

— Мы не страцілі сваіх кліентаў. На ліпень атрымалі вялікі заказ з Еўрапейскага саюза і плануем хутка аднавіць ранейшыя аб'ёмы , — паведаміў **генеральны дырэктар ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў» Аляксандр СУДНІК.**

Наталля Качанава пабывала ў цэхах прадпрыемства, паглядзела на працэс вырабу мэблі, пагутарыла з работнікамі. Спікера цікавіла, якую зарплату яны атрымліваюць, дзе вучацца прафесіі мэбельшчыкі, наколькі цяжкая ў іх праца, якія сацыяльныя гарантыі прапануе работадаўца.

— Даўно хацела пабываць на гэтым прадпрыемстве. Яго ведаюць далёка за межамі нашай краіны, тут выпускаюць унікальную прадукцыю, якая запатрабавана не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Мне важна было даведацца, як паўплывала на фабрыку сітуацыя з пандэміяй, калі былі прыпыненыя кааперацыйныя сувязі, парушаная пастаўка некаторых тавараў. Я ўбачыла, што гэта стабільнае прадпрыемства, якое працуе дастаткова эфектыўна. Вядома, работа вельмі складаная, на мой погляд, — тут патрэбныя шпаркасць, уменне, спрыт. Але разам з тым ёсць свабодныя рабочыя месцы, сюды можна прыйсці, і цябе адразу навучаць прафесіі, ты будзеш зарабляць столькі, колькі зможаш. Тут працуе досыць малады калектыў, людзі любяць сваё прадпрыемства. Таксама вельмі важна, што ёсць сацыяльны пакет, сацыяльныя гарантыі, — адзначыла Наталля Качанава.

Тут жа, у прасторным цэху раскрою тканін, яна сустрэлася з калектывам фабрыкі. Старшыня Савета Рэспублікі расказала пра сітуацыю ў краіне, асноўныя кірункі дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі. Былі закрануты такія праблемныя тэмы, як пастаўкі нафты ў Беларусь, пандэмія і звязанае з ёй захворванне. Таксама Наталля Качанава адказала на пытанні мэбельшчыкаў. Так, шматдзетную маці цікавіла, ці ўвойдзе дэкрэтны адпачынак у страхавы стаж. Яе калегу хвалявала перспектыва далейшага павышэння пенсійнага ўзросту. Праблему дзяржаўнай важнасці закранула адна са швачак, пацікавіўшыся, як урад мяркуе зацікаўліваць моладзь у атрыманні рабочых прафесій.

— Вы цалкам маеце рацыю, мы ўжо шмат разоў пра гэта гаварылі, — падтрымала работніцу спікер. — У нас у краіне дастаткова разгалінаваная сетка прафесійна-тэхнічных каледжаў і ліцэяў. Але сапраўды павінна быць прафарыентацыйная работа. Трэба прадпрыемствам пра гэта падумаць, якія зацікаўленыя ў тым, каб да іх прыйшлі маладыя спецыялісты. Можа быць, браць моладзь і нават даплачваць ім стыпендыі, каб падтрымаць. Мы яшчэ абмяркуем гэтае пытанне ва ўрадзе.

Наталля Качанава прызналася, што ўпершыню ў Пінску. У цэлым ёй горад спадабаўся — добраўпарадкаваны, са сваёй архітэктурай, разыначкай: прыгожыя гістарычныя будынкі, прыгожая рака, набярэжная. «Вядома, яшчэ, напэўна, шмат трэба будзе зрабіць, уладкаваць горад. Але ў яго ёсць добрая харызма. Мы сёння з актывам горада абмяркоўвалі пытанні эканомікі, таму што яны вельмі важныя на гэтым этапе. Але кіраўніцтва Пінска, дырэктары прадпрыемстваў бачаць выхад з гэтай сітуацыі, перспектывы. І я ўпэўненая, што ў горада добрая будучыня, як, несумненна, ва ўсіх тых, хто сёння добрасумленна працуе. І людзі тут гэта разумеюць», — падкрэсліла спікер.

* * *

У Лідзе старшыня Савета Рэспублікі наведала ААТ «Лакафарба». Сустрэча з яго калектывам прайшла ў форме адкрытай і даверанай размовы. Спектр пытанняў быў шырокі: цэнавая палітыка, развіццё рэгіёна і ў цэлым галін эканомікі, у тым ліку энергетыкі. Гэты кірунак актуальны для Гродзенскай вобласці тым, што менавіта на яе тэрыторыі ўзводзіцца Беларуская АЭС. Таксама Наталлю Качанаву цікавіла, як складваецца эканоміка прадпрыемства, які заробак атрымліваюць людзі, што хвалюе работнікаў «Лакафарбы» і ў цэлым жыхароў Лідскага раёна. Яшчэ адной тэмай гутаркі стала магчымае пашырэнне паўнамоцтваў мясцовых улад.

— Савет Рэспублікі — орган тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Таму мы павінны ведаць, чым жывуць рэгіёны. Разглядаючы законапраекты, мы павінны разумець, што яны ідуць найперш ад жыцця і змогуць даць эфект у развіцці прадпрыемстваў, рэгіёнаў і краіны ў цэлым. Таму складана пераацаніць важнасць такіх сустрэч. Яны дапамагаюць даведацца, што хвалюе людзей, якая складваецца сітуацыя на іх прадпрыемстве, у тым населеным пункце, дзе яны жывуць, — адзначыла Наталля Качанава.

У прыватнасці, на сустрэчы прагучалі некалькі прапаноў аб развіцці Ліды як турыстычнага цэнтра, таксама пытанні датычыліся транспартнай і дарожнай інфраструктур горада.

— Прадпрыемства было абрана невыпадкова. ААТ «Лакафарба» — адзін з брэндаў Ліды. Яго прадукцыя заўсёды карысталася попытам, яна канкурэнтаздольная на сусветных рынках. Важна было ўбачыць, як прадпрыемства працуе ў цяперашніх няпростых умовах, — адзначыла Наталля Качанава. Яна падкрэсліла, што ў цэнтры ўвагі і пытанні вытворчасці і збыту, і, вядома, рост заробкаў работнікаў.

Паводле БелТА.

«Час экспарцёрам скарыстацца «акном новых магчымасцяў»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

На маю думку, трыгерам крызісу, які паступова насоўваецца на планету, стала, перш за ўсё, рэакцыя ўладаў большасці дзяржаў на распаўсюджванне COVID-19. Гэтыя краіны ўвялі каранцін, што прывяло да закрыцця межаў, спынення авіяперавозак і транспартных зносін, прыпынення работы многіх прадпрыемстваў і парушэнняў лагістычных ланцужкоў. У выніку — сур'ёзнае падзенне попыту і зніжэнне прапановы тавараў і паслуг.

Першы пад удар антыкаранавірусных дзеянняў, па зразумелых прычынах, трапіў Кітай. Пасля трох дзесяцігоддзяў няспыннага росту эканоміка КНР упершыню сышла ў мінус — спад за першыя тры сёлетнія месяцы склаў 6,8 %. Негатыўныя наступствы распаўсюджвання COVID-19 адчуваюць і іншыя дзяржавы: прагназуецца рэцэсія найбуйнейшых эканомік свету: ЗША, Японіі, Германіі, Францыі.

— Наколькі глыбокі, на ваш погляд, будзе гэты крызіс?

— Адназначна сказаць практычна немагчыма. Бо спрагназаваць усе фактары, якія паўплываюць на сусветнае эканамічнае развіццё ў постэпідэміялагічны перыяд, вельмі цяжка. Аднак эканамічных Настрадамусаў цяпер шмат. Не выключаю таксама, што асобныя апакаліптычныя прагнозы ўкідваюцца буйнымі гульцамі наўмысна для аказання ціску на фінансавыя і таварныя рынкі з мэтай атрымання звышпрыбыткаў. Прыклады ўжо ёсць: па звестках амерыканскага Інстытута палітычных даследаванняў (IPS), на фоне страты амаль 43 мільёнамі амерыканцаў сваіх рабочых месцаў, сукупнае багацце мільярдэраў ЗША за тры месяцы пандэміі павялічылася на 565 мільярдаў долараў!

> «Нарошчванне знешнегандлёвай дзейнасці можа і павінна стаць адным з драйвераў эканамічнага развіцця рэгіёнаў. Аднак пакуль асноўны ўнёсак у экспарт Беларусі робяць сталіца і Мінская вобласць».

Мой асабісты падыход да прагнозаў: варта ў большай ступені арыентавацца на ацэнкі вядучых міжнародных эканамічных арганізацый, якія валодаюць неабходнымі аб'ёмамі даных і дзе працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты. Паводле прагнозу МВФ, у 2020 годзе сусветная эканоміка можа знізіцца на 3 %. Беларусь, на жаль, наступствы гэтага глабальнага спаду бокам не абыдуць. Нават нягледзячы на тое што беларускія ўлады не ўводзілі каранцін і не спынялі работу прадпрыемстваў. Нагадаю, беларуская эканоміка з'яўляецца экспартна арыентаванай, мае высокую ступень адкрытасці і, адпаведна, у значнай меры ўключана ў глабальныя эканамічныя адносіны.

Экспарт складае больш за палову ВУП нашай краіны.

— І ўсё ж у якой ступені можа закрануць нас эканамічны спад?

— У многім развіццё Беларусі будзе залежаць ад хуткасці аднаўлення эканамічнай актыўнасці і знешнегандлёвай дзейнасці ў нашых вядучых краінах-партнёрах: Расіі, Кітаі, Украіне, краінах ЕС. Адначасова нам неабходна зрабіць крокі па скарачэнні магчымага негатыўнага ўздзеяння знешніх фактараў на сваю эканоміку, ажыццяўляць мэтанакіраваныя захады па стымуляванні знешнеэканамічнай дзейнасці прадпрыемстваў і кампаній, скарачаць выдаткі вытворчасці, павышаць якасць экспартнай прадукцыі і яе цэнавую канкурэнтаздольнасць.

Важную ролю ў забеспячэнні эфектыўнасці экспарту ўсё больш адыгрывае кошт дастаўкі тавару: чым карацейшае так званае плячо, тым таннейшая транспарціроўка грузу і вышэйшая вераголнасць збыту тавару. Заўважу, што айчынная транспартная інфраструктура, якая гістарычна склалася, ужо з'яўляецца недастатковай для транзіту экспартных тавараў праз тэрыторыю нашай краіны.

Каб больш актыўна дыверсіфікаваць экспартныя пастаўкі, знізіць у тым ліку пэўную лагістычную залежнасць ад некаторых краін, важна ў перспектыве сфарміраваць моцную інфраструктурную вось па лініі Поўнач—Поўдзень, пашырыць прапускную здольнасць чыгуначных і аўтамабільных шляхоў у напрамку буйных партоў і іншых транспартных вузлоў. Гэта не толькі павысіць ролю і значэнне Беларусі як транзітнай дзяржавы, але і забяспечыць нашых экспарцёраў аптымальнымі маршрутамі транспарціроўкі тавараў.

— На нядаўнім пасяджэнні секцыі навукова-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі на тэму падтрымкі экспарту беларускіх тавараў і паслуг ва ўмовах сучасных выклікаў, якое было ініцыявана вашай Пастаяннай камісіяй, вы казалі пра «акно новых магчымасцяў» для айчыннай эканомікі. Што канкрэтна вы мелі на ўвазе?

— Тут трэба мець на ўвазе, што любы сусветны эканамічны крызіс як мае негатыўныя наступствы, так і дае магчымасці для геаграфічнай дыверсіфікацыі экспарту тавараў і паслуг. Ён таксама дае штуршок для нарошчвання выпуску пэўнага віду прадукцыі павышанага попыту на канкрэтных рынках. Такое «акно магчымасцяў» можа адкрыцца і ў асобна ўзятай краіне, якая часова перажывае пэўныя эканамічныя цяжкасці ў выніку наступстваў, напрыклад, палітычнай турбулентнасці. Як гэта, напрыклад, было ў краінах пад уздзеяннем падзей «арабскай вясны».

У такі час многія замежныя кампаніі, як правіла, прыпыняюць сваю дзейнасць або зусім сыходзяць з рынку нестабільнай краіны з-за высокіх палітычных і фінансавых рызык. Тым самым адкрываюцца новыя экспартныя «нішы», якія могуць і павінны запоўніць беларускія тавары і паслугі. Але тут нашым вытворцам варта распачаць актыўныя дзеянні па прасоўванні сваіх знешнегандлёвых інтарэсаў. Скажам, беларускіх прадуктаў харчавання.

Як вядома, наша краіна ў лідарах вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі сярод краін СНД. Таму бягучы момант на сусветным харчовым рынку, калі ў многіх краінах назіраецца скарачэнне сельскагаспадарчай вытворчасці з-за пандэміі, важна выкарыстаць як для пашырэння геаграфіі паставак, так і для нарошчвання аб'ёмаў экспарту харчовай прадукцыі.

Беларусь мае распрацоўкі важных лекаў і медыкаментаў, у тым ліку антыбіётыкаў і прэпаратаў для лячэння анкалагічных захворванняў. Да іх праяўляюць вялікую цікавасць некаторыя краіны «далёкай дугі». Гэта яшчэ адно «акно магчымасцяў» для нашых удзельнікаў знешнеэканамічнай дзейнасці.

Уведзеныя многімі краінамі абмежаванні стымулявалі развіццё рынку асобных відаў паслуг. Мы павінны больш актыўна задзейнічаць наш IT-сектар і тым самым істотна павялічыць экспарт тых лічбавых паслуг, попыт на якія выклікала эпідэмія. Чаму б не стварыць нацыянальную поўнафункцыянальную лічбавую інтэграваную платформу знешнегандлёвай дзейнасці? Яна дапамагла б прасоўваць нашы тавары на замежныя рынкі сучаснымі метадамі.

Характэрная асаблівасць экспарту Беларусі — адносна недарагія транспартныя, будаўнічыя і іншыя паслугі, якія звязаныя з паездкамі ў нашу краіну. Назіраецца рост цікавасці да нашых тэлекамунікацыйных, камп'ютарных і інфармацыйных паслуг. Іх асноўнымі спажыўцамі з'яўляюцца плацежаздольныя краіны ЕС.

— А калі неўзабаве зноў грымне глабальны крызіс, то што ён знясе ў нас у першую чаргу? Відаць, тыя прадпрыемствы, якія выпускаюць састарэлую і неканкурэнтаздольную прадукцыю. Адсюль і пытанне: што сёння можа і павінна рабіць у рэгіёнах мясцовая ўлада, каб стымуляваць экспартную актыўнасць сярэдніх і малых прадпрыемстваў?

— Калі адказаць лаканічна і ў стылістыцы вашага пытання, то кожны сусветны крызіс можа знесці неэфектыўныя вытворчасці і неэфектыўных менеджараў. Хутчэй за ўсё, гэта можа адбыцца і без глабальнага крызісу ў сілу разгортвання жорсткай канкурэнцыі за рынкі. Выклікам для нашых вытворцаў з'яўляюцца не толькі наступствы пандэміі, але і нарастанне канкурэнтнай барацьбы за рынкі збыту. Каб не прайграць, важна задзейнічаць усе магчымыя рэсурсы як вялікага, так і сярэдняга і малога бізнесу для вытворчасці канкурэнтаздольнай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю.

Сёння важна актывізаваць рэгіянальную экспартную дзейнасць. Падтрымліваю меркаванне старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай аб неабходнасці працаваць над раўнамерным развіццём рэгіёнаў нашай краіны. У цэлым гэтаму пытанню трэба аддаць асаблівую ўвагу ў наступнай пяцігодцы. Нарошчванне знешнегандлёвай дзейнасці можа і павінна садзейнічаць вырашэнню гэтай задачы і стаць адным з драйвераў эканамічнага развіцця рэгіёнаў. Аднак пакуль асноўны ўнёсак у экспарт Беларусі робяць сталіца і Мінская вобласць.

Магчыма, варта ўзмацніць міжнародную спецыялізацыю рэгіёнаў і гарадоў з улікам іх канкурэнтных пераваг, перш за ўсё ў частцы экспарту навукаёмістай і складанай тэхнічнай прадукцыі, дзелавых, турыстычных і адукацыйных паслуг. Станоўчы вопыт рэгіёнаў ужо набыты ў экспарце высокатэхналагічных тавараў: аптычнай і вымяральнай апаратуры, фармацэўтычнай і электратэхнічнай прадукцыі.

Вельмі важна выключыць канкурэнцыю на знешніх рынках паміж беларускімі вытворцамі аднатыпнай прадукцыі, напрыклад, тралейбусамі МАЗа і «Белкамунмаша», трамваямі «Штадлер-Беларусь» і «Белкамунмаша», сельскагаспадарчым навясным і прычапным абсталяваннем некаторых прадпрыемстваў. Мясцовыя органы ўлады могуць засяродзіцца на інфармацыйна-арганізацыйнай падтрымцы маштабнага і сярэдняга бізнесу, паколькі галоўная праблема экспарту іх прадукцыі — невялікія партыі паставак, недахоп інфармацыі і слабыя фінансавыя магчымасці для арганізацыі вывучэння кан'юнктуры рынку.

— Развіццё экспартнага патэнцыялу краіны ў новых умовах запатрабуе і новых падыходаў, у тым ліку, магчыма, і заканадаўчых ініцыятыў з боку парламента. Чаго можна, у гэтым выпадку, чакаць ад членаў Савета Рэспублікі?

— Паспяховасць экспартнай дзейнасці шмат у чым вызначаецца ўмовамі, якія забяспечваюцца законамі і нарматыўнымі прававымі актамі — яны рэгулююць парадак экспарту тавараў і паслуг. У нашай краіне ў цэлым створана спрыяльнае прававое асяроддзе для развіцця экспартнага патэнцыялу прадпрыемстваў, яно пастаянна ўдасканальваецца і паляпшаецца.

Падчас дыскусіі экспертаў у Савеце Рэспублікі было прапанавана, напрыклад, падоўжыць тэрмін дзеяння Указа Прэзідэнта ад 24 верасня 2009 года № 466 на 2021—2025 гады і павялічыць памер кампенсацыі часткі працэнтаў па крэдытах і лізінгавых плацяжах за кошт сродкаў бюджэту да ўзроўню ставак рэфінансавання, устаноўленых у дзяржавах, на тэрыторыі якіх рэалізуецца прадукцыя беларускіх вытворцаў.

На рэгулярнай аснове прымаюцца змены ў нарматыўна-прававыя акты, якія даюць больш магчымасцяў «Банку развіцця Рэспублікі Беларусь» для падтрымкі экспарту беларускіх тавараў і паслуг.

Прывяду прыклад. Сёлета ў красавіку—маі Саветам Рэспублікі было адобрана 37 законапраектаў, 17 з якіх спрыяюць развіццю знешняга гандлю і экспарту беларускіх тавараў і паслуг. Будзем працягваць аптымізаваць заканадаўства ў сферы падтрымкі экспарту з улікам сусветнай практыкі і функцыянавання беларускай мадэлі эканомікі.

Акрамя традыцыйных формаў эканамічнай дыпламатыі, мэтазгодна максімальна задзейнічаць патэнцыял парламентарыяў для рэалізацыі міждзяржаўных дамоўленасцяў, дасягнутых на вышэйшым і высокім узроўнях у частцы прасоўвання знешнеэканамічных інтарэсаў Беларусі ў краінах «далёкай дугі». У рамках розных візітаў беларускіх сенатараў за мяжу, пасяджэнняў міжпарламенцкіх камісій вядзецца пастаянны маніторынг выканання планаў, пратаколаў і «дарожных картаў» эканамічнага супрацоўніцтва.

У Савеце Рэспублікі створаны рабочыя групы па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў, кіраўнікі якіх рэгулярна ўдзельнічаюць у пасяджэннях двухбаковых міжурадавых камісій па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве і па магчымасці садзейнічаюць прасоўванню беларускіх тавараў і паслуг у краіны-партнёры.

Падрыхтаваў
Леанід ЛАХМАНЕНКА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ГРОДЗЕНШЧЫНА

Палепшыцца транспартны рух

У Гродне рыхтуецца да пуску адзін з самых працяглых тралейбусных маршрутаў, які звяжа два новыя мікрараёны — Грандзічы і Альшанку.

Па ім стануць курсіраваць бескантактныя тралейбусы. Маршрут уводзіўся ў дзеянне паэтапна. Напачатку была ўведзена першая частка, даўжынёй 30 кіламетраў, другі этап пашырыў маршрут удвая. Трэба сказаць, што Гродна вельмі хутка разрастаецца, вядзецца забудова наваколля як індывідуальнымі дамамі, так і шматпавярховікамі. Паралельна гэтаму вядзецца і забеспячэнне навасёлаў транспартнай інфраструктурай. Як паведаміў **намеснік дырэктара Гродзенскага тралейбуснага ўпраўлення Андрэй ЭЙСМАНТ**, горад рухаецца ў бок перавагі транспарту з аўтаномным ходам. Дарэчы, менавіта Гродна стаў першым горадам у краіне, дзе пачаў курсіраваць бескантактны тралейбус. Цяпер у парку іх 15, летась атрымалі 10 машын беларускай вытворчасці. Сёння яны забяспечваюць рух на трох маршрутах. Самым працяглым стане новы шлях, які звяжа дальнія мікрараёны — Грандзічы і Альшанку. Яго «кола» складзе каля 60 кіламетраў. Варта сказаць, што маршрут пройдзе па добраўпарадкаванай магістралі.

У горадзе аддаецца вялікая ўвага рамонту дарог. Літаральна напярэдадні Дня незалежнасці ўведзены ў дзеянне некалькі ўчасткаў у цэнтральнай частцы Гродна. Вядзецца замена камунікацый і ўкладваецца новае асфальтавае пакрыццё. Але не толькі. Ставяцца новыя металічныя агароджы, добраўпарадкоўваюцца прыпынкі транспарту, пераходы. Асаблівая ўвага аддаецца будаўніцтву жылля і сацыяльных аб'ектаў. Сёлета плануецца пабудаваць 25 шматпавярховікаў, галоўным чынам у новых мікрараёнах — Грандзічах і Альшанцы, якія знаходзяцца адпаведна на поўначы і поўдні абласнога цэнтра. Гэтыя напрамкі будуць развівацца як у жыллёвым, так і сацыяльна-інфраструктурным плане. Значна палепшыць транпартны рух паміж двума мікрараёнамі новы мост, рэканструкцыя якога зараз актыўна вядзецца.

А вось будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплекса ў Навагрудку цалкам завершана. Урачыстае адкрыццё з удзелам абласных улад адбудзецца напярэдадні Дня Незалежнасці. Новы комплекс, які атрымаў назву «Лідар», у Навагрудку лічаць самым маштабным за апошняе дзесяцігоддзе. Гэта першы такога роду спартыўны аб'ект раёна. Адна толькі спартыўная зала зможа змясціць 750 балельшчыкаў. Дарэчы, гэта самае вялікае памяшканне комплексу. Тут змогуць займацца аматары футбола, валейбола, баскетбола і гандбола. Не абышлося і без басейна з пяццю дарожкамі, працягласць якіх 25 метраў. У новым комплексе абсталявана таксама трэнажорная зала і памяшканне для заняткаў фітнесам. Будзе тут і кафэ на 30 пасадачных месцаў.

Хоць праект даволі маштабны, ён узведзены менш чым за два гады. Яго агульны кошт складае каля 12 мільёнаў рублёў. Асаблівая ўвага аддадзена тэхнічнаму абсталяванню — тут і забяспечанасць інтэрнэтам, тэлекамунікацыямі, відэаназіранне і іншае. Дзякуючы гэтаму адсюль можна весці прамыя тэле- і радыётрансляцыі мерапрыемстваў. Таксама комплекс будзе даступны для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Як паведамілі ў абласным упраўленні будаўніцтва і архітэктуры — на чарзе здача першага пускавога комплексу маштабнай рэканструкцыі Лідскай цэнтральнай раённай бальніцы, на які з абласнога бюджэту выдзелена больш за два мільёны рублёў. Тут цалкам адноўлены хірургічны корпус, зроблена новая прыбудова, дзе будзе ўстаноўлены новы камп'ютарны тамограф. Будзе закуплена іншае сучаснае абсталяванне, якое дазволіць аказваць якасную медыцынскую дапамогу жыхарам не толькі Лідскага раёна, але і суседніх. Завяршыць работы плануецца ў ліпені.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Жыві і квітней, Беларусь! Пабудавана ў Беларусі

МАГІЛЁЎШЧЫНА

Дом для вялікай сям'і

Да Дня Незалежнасці яшчэ адна прыёмная сям'я ў Бабруйску справіць наваселле

ШЧАСЛІВАЯ падзея адбудзецца ў сям'і Святланы і Пятра КАРАХАНАВЫХ. Двухпавярховы катэдж каля чыгуначнага вакзала на вуліцы Камсамольскай хутка ажыве і зазвініць дзіцячымі галасамі. Яшчэ на мінулым тыдні тут устаўлялі вокны, клеілі шпалеры, наводзілі марафет — спяшаліся завяршыць прыгатаванні да свята горада і Дня Незалежнасці.

Дзяржава дала магчымасць пазбаўленым бацькоўскай ласкі дзецям жыць не горш за аднагодкаў. Дастаткова прайсціся па пакоях новага дома і пераканацца. Светлыя і прасторныя памяшканні, вялікая кухня — ёсць дзе сабрацца вялікай сям'і. Як-ніяк, тут будуць жыць з прыёмнымі бацькамі каля 10 дзяцей. Побач з домам парк, стадыён — усё, што трэба для паўнавартаснага развіцця падрастаючага грамадзяніна. Напярэдадні навасельля карэспандэнт «МС» пацікавілася ў Святланы і Пятра, з якімі адчуваннямі яны ўязджаюць у свой новы дом.

— Пачуцці ўзнёслыя, хоць вельмі стаміліся — то мэблю выбіралі, то шторы, то яшчэ што-небудзь, — усміхаецца гаспадыня. — Але гэта прыемныя клопаты. Усе выдаткі ўзяла на сябе дзяржава. Напрыклад, мэблю для кухні рабіла гомельская фабрыка, але па нашым асабістым заказе. Увесь час знаходзіліся на тэлефоннай сувязі, узгаднялі кожны крок. Плошча новай кухні — каля 20 метраў. Уяўляеце, якая гэта раскоша! Можна паставіць вялікі стол, дзе кожнаму знойдзецца месца. У нашым папярэднім доме кухня таксама была вялікая, але гэтая з ёй не ідзе ні ў якае параўнанне. Там толькі на сем чалавек месца хапала, а тут памесціцца ўдвая больш.

ПАДАРУНКІ ДА СВЯТА

У рамках святкавання Дня Незалежнасці ў Магілёўскай вобласці адбудзецца ўвод у дзеянне моста цераз раку Сож у раёне Слаўгарада. Гэта адзін з маштабных праектаў сацыяльна-эканамічнага развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна вобласці. Працягласць моста — амаль паўкіламетра, ён лічыцца адным з самых доўгіх у вобласці. Мост з'яўляецца часткай трасы Р-140, якая злучае Беларусь з суседняй Расіяй. Для пакрыцця аўтапалатна выкарыстаны трывалы цэментабетон, які можа праслужыць без капрамонту не менш за сорак гадоў. Сярод аб'ектаў, якія будуць уведзены ў эксплуатацыю ў гэтыя святочныя дні, таксама басейн для школы № 46 у Магілёве, падстанцыя № 1 для Бабруйскай станцыі хуткай неадкладнай медыцынскай дапамогі.

Першапачаткова ў Караханавых была звычайная сям'я, двое сваіх дзяцей, але 16 гадоў таму яны ўзялі пад апеку дзяўчынку і адчулі, як гэта выдатна — зрабіць яшчэ кагосьці шчаслівым. Цяпер тая прыёмная дачушка дарослая, скончыла інстытут, працуе настаўнікам англійскай мовы ў Гомелі. А Святлана з Пятром сталі прыёмнымі бацькамі ўжо не для аднаго дзіцяці.

— Я працавала ў дзіцячым садку і, калі па дарозе на работу праязджала дзіцячы прытулак, сэрца так і клікала туды зайсці — вельмі хацелася яшчэ камусьці дапамагчы, — прызнаецца жанчына. — І аднойчы мы з мужам звярнуліся ў аддзел адукацыі і афармілі прыёмную сям'ю. Так у нас у доме з'явіліся два браты і сястрычка. А тры гады таму ўзялі на выхаванне яшчэ двух хлопчыкаў. З папярэдняй тройкі адзін хлопчык ужо вырас, дзяўчынку ўдачарылі, а хутка дом пакіне і іх брат, якому ўжо 16 гадоў. Акрамя яго, цяпер на выхаванні тры маленькія хлопчыкі, абодвум з якіх па пяць гадоў, а аднаму — шэсць.

Калі Святлане і Пятру прапанавалі ўзяць на выхаванне яшчэ дваіх дзетак і пераехаць у дзіцячы дом сямейнага тыпу, яны нават не раздумвалі. Іх папярэдні дом ужо стаў цесны для вялікай сям'і. Дарэчы, новых выхаванцаў чакаюць у сямейным калектыве адразу ж пасля аздараўленчага летніка.

Выхаваць чужое дзіця — вялікая адказнасць, але для Караханавых гэта ўжо стыль жыцця.

— Калі першыя з нашых прыёмных дзяцей пакінулі дом, было сумна, — заўважае Святлана. — Я нават прачыналася з думкай, што ў нас ёсць вольны ложак для адзінокага дзіцяці. Гэта была нейкая катастрофа.

Фразу «пажыць для сябе» Святлана і Пётр успрымаюць зусім інакш, чым іншыя. У іх разуменні яна значыць — акружыць сябе дзецьмі. Нядаўна паехалі ў магілёўскі спецыялізаваны дом дзіцяці, каб на аднаго малога стала больш. Але пасля таго як адзін хлопчык залез на калені да Пятра, а другі да Святланы, вырашылі: бяруць абодвух.

— Гэта ж так цудоўна, калі ў доме шмат дзяцей, — усміхаецца жанчына. — Уяўляеце, раніцай вы прабудзіліся ад босых ножак, якія спыніліся ля вашага ложка, ад пяшчотных ручак, якія абнялі вас за шыю, ад ласкавага «матулечка», што прашапталі дзіцячыя вусны. Для мяне гэта найвышэйшая мера асалоды.

Некаторыя здзіўляюцца сужэнцам: як можна ўзваліць на сябе такі цяжар! Але так здаецца, пакуль не паспрабаваў. Наадварот, адказнасць дысцыплінуе, а дзеці, назіраючы за бацькамі, таксама лайдакамі не растуць.

— Мы вучым дзяцей працаваць. Па-першае, нам цяжка адным з усім спраўляцца, па-другое, хто іх гэтаму навучыць, калі не мы, — разважае Святлана. — Калі ў нас была пад апекай першая дзяўчынка, я была яшчэ нявопытная маці, увесь час сумнявалася, ці даваць ёй венік у рукі. А потым вырашыла: калі я яе не навучу, то яна наогул не навучыцца жыць. Мы з ёй паразмаўлялі на гэты конт і знайшлі паразуменне. Дзяўчынка наогул анёл. Калі яе тата памёр, а маці кінула, паўстала пытанне наконт перадачы яе ў інтэрнат. Нам пра яе расказалі знаёмыя, і мы забралі дзяўчынку да сябе. Цяпер яна дарослая, выйшла замуж, нарадзіла дзіця. Я для яе засталася маці, а яна мая дачка. А вось з роднай маці ў яе не склалася. Тая спрабавала наладзіць з ёй зносіны, але толькі для таго, каб цягнуць з яе грошы. Пры гэтым ні разу не сказала, што любіць яе, сумуе па ёй. Для дзяцей важна, каб было куды прыехаць, да каго звярнуцца. Інакш потым яны і свае сем'і не будуць ведаць, як захаваць. А ў нас яны вучацца будаваць узаемаадносіны, ладзіць адно з адным.

Караханавы кажуць, што не толькі дзеці вучацца ў іх жыццю, але і яны ў дзяцей. Менш сталі мець прэтэнзій адно да аднаго. Быў перыяд, калі сужэнцы моцна сварыліся, думалі нават пра развод. Але з'явіліся прыёмныя дзеці — і жыццё стала наладжвацца. Даводзілася трымаць язык за зубамі, каб не ляпнуць чагосьці лішняга: разумелі, што ў малых лёс і так паламаны.

Сужэнцы кажуць, што прынцыпова не ўсынаўляюць дзяцей, таму што не жадаюць перашкаджаць ім мець зносіны са сваімі бацькамі.

— Калі нашым першым хлопчыкам было па тры-чатыры гадкі, мы ім расказалі, што ў іх ёсць маці, але яна згубілася і можа аднойчы прыйсці, — расказвае Святлана. — У аднаго нашага хлопчыка маці ў турме сядзіць, а ў другога — хварэе і не можа яго даглядаць. Як можна пазбавіць яго гэтых зносін? Сёння дзяржава правадзіць палітыку па падтрыманні біялагічных сем'яў і іх аднаўленні. Дзеці павінны ведаць свае карані. Якія б добрыя ні былі прыёмныя бацькі, дзеці шукаюць сваіх родных. Яны павінны ведаць, што акрамя тых бацькоў, якія іх гадуюць, ёсць і тыя, што іх нарадзілі. І яны не заўсёды былі дрэнныя — проста так склаўся лёс.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва сям'і Караханавых.

❍ Каментарый у тэму

Святлана НІКІЦІНА, дырэктар Магілёўскага абласнога сацыяльна-педагагічнага цэнтра:

— У вобласці гэта будзе ўжо 51-ы дзіцячы дом сямейнага тыпу. Дзяржаўная палітыка ў адносінах да дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, з'яўляецца сістэмай сацыяльна-эканамічных, палітычных, эканамічных і арганізацыйных прававых мер, якая накіравана на стварэнне ўмоў для абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей. Асаблівыя намаганні дзяржава накіроўвае на рэалізацыю прыярытэтнага права кожнага дзіцяці на выхаванне ў сям'і. Адным з паказчыкаў сістэмы ў рабоце з'яўляецца адкрыццё дзіцячага дома сямейнага тыпу ў Бабруйску. У вобласці сёння застаўся толькі адзін «традыцыйны» дзіцячы дом у Бабруйску: звыш 80 % дзяцей жывуць у замяшчальных сем'ях. Дарэчы, у Бабруйску год таксама пачынаўся з адкрыцця дзіцячага дома сямейнага тыпу. Прайшло паўгода, і мы адзначаем яшчэ адно навасельле.

На адной хвалі

ЧЫТАЕМ КАРАТКЕВІЧА РАЗАМ

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае прыхільнікаў творчасці Уладзіміра Караткевіча выступіць у эфіры з любімымі творамі, напісанымі пісьменнікам. З ліпеня творчая група радыёстанцыі абвяшчае інтэрактыўны конкурс чытальнікаў «Быў. Ёсць. Буду».

Праект прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння класіка айчыннай літаратуры і 95-годдзю Беларускага радыё. Тым, хто жадае прадставіць уласнае чытанне сваіх любімых вершаў пісьменніка, неабходна да 30 верасня даслаць на электронную пошту kultura_konkurs@tvr.by аўдыя- ці відэафайл з выбраным творам. Фіналістаў адбору вызначыць прафесійнае журы ў кастрычніку. Акрамя гэтага, галасаванне за найлепшага чытальніка вершаў Уладзіміра Караткевіча пройдзе ў інтэрнэце.

— Творчасць Уладзіміра Сямёнавіча прыцягвае ўвагу чытачоў самых розных узростаў. Таму мы не абмяжоўваем удзельнікаў: гэта могуць быць і школьнікі малодшых класаў, і прафесійныя акцёры, і аматары. Усе ўмовы правядзення творчага спаборніцтва можна знайсці на нашым сайце www.radiokultura.by, — адзначае дырэктар канала «Культура» Уладзімір Трапянок.

— А ў галерэі вывешаны партрэты нашых спартсменаў, якія заваявалі медалі на еўрапейскім і сусветным узроўнях. Школа культывуе пяць відаў спорту: баскетбол, барацьбу вольную жаночую, барацьбу грэка-рымскую, лёгкую атлетыку, футбол. Акрамя таго, плануецца адкрыццё аддзялення па плаванні, — канстатуе Алена Уладзіміраўна. — У 2016 годзе ДЮСШ атэставалася як спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая спартыўная школа Алімпійскага рэзерву. Цяпер 22 нашы выхаванцы вучацца ў вучылішчах Алімпійскага рэзерву. За чатыры гады 28 нашых выхаванцаў перайшлі ў вышэйшае звяно падрыхтоўкі.

Новы комплекс перададзены на баланс упраўлення спорту і турызму Пухавіцкага райвыканкама. Тут будуць займацца не толькі выхаванцы спартыўнай школы, але і іншыя дзеці, якія хочуць навучыцца плаваць, а таксама вучні агульнаадукацыйных школ, дзе ў вучэбнай праграме прадугледжана такая дысцыпліна, як плаванне. Гэтаму, вядома, яны бязмежна рады, паколькі ні ў адной з установ адукацыі раёна няма басейна. Цяпер яны атрымалі выдатную магчымасць развіваць свае навыкі пад кіраўніцтвам настаўнікаў па фізічным выхаванні, вопытных інструктараў.

Цэнтр будзе аказваць насельніцтву платныя паслугі, па папярэдніх падліках кошт адной гадзіны знаходжання будзе на ўзроўні пяці рублёў.

— Ці задаволены вы плёнам сваёй працы? — пацікавілася ў **выканаўцы работ унітарнага прадпрыемства «БУ № 20 ААТ «Мінскпрамбуд» Дзмітрыя ЗАРЫХТЫ.**

— Наша арганізацыя ўзводзіла шмат аб'ектаў у Мінску і Беларусі. Мы заўсёды гарантуем якасць, прытрымліваемся айчынных і замежных стандартаў. Будавалі мы аб'екты і ў Расійскай Федэрацыі. Прэтэнзій ад заказчыкаў не атрымлівалі. Асабліва прыемна будаваць такія сацыяльныя і спартыўныя аб'екты, як у Мар'інай Горцы. Адчуваем задавальненне, бо яны прыносяць радасць і здароўе людзям, — лічыць Дзмітрый. — Наша арганізацыя ўзвяла гэты будынак крыху больш чым за год пад ключ. Апошні час колькасць будаўнікоў даходзіла да 200, стараліся, каб своечасова ўкласціся ў нарматыўныя тэрміны. Цяпер перадаём памяшканне ўласніку, займаемся пусканаладачнымі работамі, каб увесці комплекс у дзеянне да канца месяца.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ВІЦЕБШЧЫНА

ШКОЛА З ЛІФТАМ

Адкрыццё новай школы ў віцебскім спальным мікрараёне Білева, дзе пачалі ўзводзіць жыллё пятнаццаць гадоў таму, стане доўгачаканай і знакавай падзеяй. Установа адукацыі хутка будзе здадзена ў эксплуатацыю. Аб'ект гэты ўнікальны, і не толькі для Віцебшчыны. Незадоўга да Дня Незалежнасці карэспандэнт «МС» пабываў на цікавай новабудоўлі.

Па-першае, школа на вуліцы Багатырова — самая вялікая ў абласным цэнтры па колькасці будучых вучняў: яна разлічана на 1020 чалавек у змену. Яшчэ яе неардынарнасць у тым, што ў школе будзе басейн, і не адзін, а адразу два: даўжынёй 25 метраў у тры дарожкі і так званы жабнік. Знаходзяцца яны ў шыкоўным спартыўным комплексе, які злучае з вучэбнай часткай галерэя. Акрамя таго, у спартыўнай зоне ёсць цудоўныя трэнажорныя залы.

Дарэчы, каб людзі з абмежаванымі магчымасцямі маглі трапіць на фізкультуру, тут ёсць ліфт. Такіх прыкладаў ва ўсёй краіне нямнога. Будзе ў школе і цір.

Плануецца, што спартыўныя залы, як і басейн, будуць актыўна выкарыстоўвацца для аказання платных паслуг мясцовым жыхарам. Такія месцы для актыўнага адпачынку ў Білеве даўно неабходныя.

У гэтай сярэдняй школы пакуль няма афіцыйнага нумара, бо яна яшчэ лічыцца будоўляй.

Па суседстве знаходзіцца СШ № 46, якая расчыніла дзверы каля дзесяці гадоў таму. Гэтая «старэйшая сястра» новай школы, разлічаная на каля 1000 вучняў, не магла прыняць усіх ахвотных. Падмурак новай заклалі ў 2012-м. Потым з-за праблем з фінансаваннем аб'ект, на жаль, стаў даўгабудам.

Разумеючы ўсю важнасць і запатрабаванасць яшчэ адной навучальнай установы ў гэтым мікрараёне, мясцовая ўлада пастаралася, каб бюджэтная крыніца фінансавання не вычэрпвалася і была стабільная. Пачынаючы з 2017 года, будаўніцтва актыўна працягнулася.

Добраўпарадкаванне школы ў Білеве.

Памер інвестыцый з пачатку ўзвядзення склаў каля 23,8 мільёна рублёў, у тым ліку сёлета — каля 3,5 мільёна.

Пасля таго як будуць падпісаны дакументы аб прыёме будынку ў эксплуатацыю, у гарвыканкаме прымуць рашэнне аб стварэнні школы і наданні ёй нумара, пачнуць прымаць заявы бацькоў наконт вучобы тут дзяцей.

Дырэктар навучальнай установы Артур ЦЕРАШКОЎ адзначыў, што плануецца запрасіць на работу каля 150 настаўнікаў. А ўсяго будзе створана прыкладна 250 рабочых месцаў.

Генеральны падрадчык на аб'екце — найбуйнейшая ў вобласці арганізацыя ААТ «Будаўнічы трэст № 9». Паводле слоў дырэктара школы, будаўнікі працуюць добрасумленна, як і субпадрадчыкі. Усе недахопы выпраўляюцца аператыўна.

У дзень падрыхтоўкі рэпартажу работа кіпела як унутры, так і звонку. У класах збіралі і ўстанаўлівалі парты, шафы, іншую мэблю, манціравалі разеткі, а на тэрыторыі рабілі азеляненне і добраўпарадкаванне.

Новая школа ў Білеве.

Яшчэ не быў цалкам гатовы вулічны спартыўны гарадок. Напрыклад, не ўсталявалі вароты на футбольным полі, якіх тут два — вялікае і малое. У гульнявых зонах, як і на дарожках для бегу, — пакрыццё, якое пры падзенні абароніць ад траўмаў. Вельмі цікава будзе дзятве і на пляцоўцы, дзе навучаць правілам дарожнага руху.

Дарэчы, Білева — раён, які актыўна забудоўваецца. Тут будуць і надалей развіваць сацыяльную інфраструктуру. Пазалетась тут адкрылі дзіцячы садок № 113 «Васілёк», разлічаны на адначасовае знаходжанне каля 200 хлопчыкаў і дзяўчынак. На цырымоніі адкрыцця гаварыў госць, які доўгі час узначальваў Віцебскі аблвыканкам, **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** нагадаў, што будаўніцтва жылля ў мікрараёне пачалося ў красавіку 2005 года. Адкрыццё ўстановы адукацыі спікер ніжняй палаты парламента назваў тады значнай падзеяй не толькі для горада, але і ў цэлым для краіны.

Губернатар Мікалай ШАРСНЁЎ падлічыў, што з кожным годам у Білеве юных гараджан становіцца на тысячу больш. Між іншым, гэты раён можна назваць самым экалагічна чыстым раёнам Віцебска, і ён становіцца адным з самых перспектыўных для пражывання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

БРЭСТЧЫНА

ШКОЛА, ФЕРМА, ЦЭХ

На Піншчыне гатовыя да адкрыцця тры значныя аб'екты

ДЗЕНЬ Незалежнасці гэтым разам Піншчына будзе адзначаць у Парахонску. Акрамя традыцыйных святочнага мітынгу і ўскладання кветак да помніка баявой славы тут урачыста адкрыюць адразу некалькі новых аб'ектаў. І калі новы малочнатаварны комплекс ААТ «Парахонскае», а таксама цэх па сарціроўцы і перапрацоўцы ягад прадпрыемства «Палескія журавіны» ўзведзеныя фактычна з нуля, то дзіцячая школа мастацтваў перажыла такую рэканструкцыю, што па сутнасці стала фактычна новай.

Наладка абсталявання ў новым цэху «Палескіх журавін».

Для ўзорных калектываў

— Наша школа сёлета адзначае сваё 40-годдзе, — гаворыць **дырэктар Пётр САЛАМЯНЮК**. — Фактычна да юбілею мы атрымліваем такі доўгачаканы падарунак. Рамонт пачаўся летась. У нашым будынку замянілі сістэму ацяплення і падлогу, паставілі новыя вокны і дзверы. Таксама адрамантаваныя фасад, ганак, з'явіўся новы дах. А нядаўна мы з задавальненнем вынеслі старую мэблю, якая служыла вучням і настаўнікам з моманту адкрыцця школы, і распакавалі новую. Усё вельмі зручнае, сучаснае, стыльнае. І вось перад вамі — фактычна новая школа.

На выкананне рамонтных работ на гэтым аб'екце з бюджэту выдаткавана 310 тысяч рублёў, яшчэ звыш 50 тысяч пайшло на мэблю, паведамілі ў Пінскім райвыканкаме.

Цяпер у школе па класах баяна, акардэона, фартэп'яна, духавых інструментаў, а таксама ў класе харэаграфіі займаюцца 125 хлопчыкаў і дзяўчынак з Парахонска і іншых навакольных вёсак. Расклад састаўлены так, каб дзяцей на заняткі падвозіў школьны аўтобус.

Паводле слоў настаўнікаў, дзеці займаюцца з задавальненнем і паказваюць добрыя вынікі як у музыцы, так і танцах. Вясковая школа мае сем творчых калектываў, два з якіх у розны час атрымалі званне ўзорных. Узорны ансамбль народнай песні і музыкі «Красачкі» выступаў не толькі ў сваім раёне, але і далёка за яго межамі. А вось узорны духавы аркестр акрамя таго, што нязменны ўдзельнік раённых мерапрыемстваў, не раз выступаў на сцэнах розных філармоній, прыязна быў прыняты сталічнымі слухачамі.

У школе разам з філіялам у вёсцы Сошна працуюць 15 настаўнікаў. Цікава, што восем з іх з'яўляюцца выпускнікамі Парахонскай дзіцячай школы мастацтваў. Сёння абноўленай школе радуюцца педагогі, выхаванцы, іх бацькі і аднавяскоўцы, якія любілі канцэрты юных спевакоў, музыкантаў, танцораў.

Электронная ачыстка ягад

Прадпрыемства «Палескія журавіны», якое размешчана ў вёсцы Селішча, у многім унікальнае. Журавіны тут вырошчваюць каля 30 гадоў. А збор ураджаю, калі журавінавыя плантацыі запаўняюць вадой, ператвараючы ў чырвоныя азёры, заўсёды прывабліваў фатографаў. Адмысловымі прыстасаваннямі — бонамі — чырвоныя ягады падцягваюць да месца збору. А трактар спецыяльным агрэгатам збівае журавіны, каб яны падняліся на паверхню вады. Карцінка сапраўды відовішчная, а работа на плантацыі — нялёгкая.

З гектара тут збіраюць да 30 тон буйнаплодных журавін. Прадпрыемства вырошчвае таксама буякі, рабіну, парэчкі чорныя, маліны, іншыя ягады, а таксама перапрацоўвае лясную вітамінную прадукцыю. Вялікая частка яе ідзе на экспарт. Дваццаць гадоў таму ўведзены ў строй бельгійскі нізкатэмпературны комплекс на тры камеры для адначасовага захоўвання каля 500 тон ягад. Але ж прадпрыемства развіваецца.

— Узвялі новы пункт сарціроўкі і перапрацоўкі ягаднай прадукцыі, — расказвае **дырэктар ААТ «Палескія журавіны» Васіль ЛЯГУСКІ**. — У гэтым вытворчым падраздзяленні будзе ажыццяўляцца поўны цыкл перапрацоўкі сыравіны ўласнай вытворчасці — ад уласна перапрацоўкі да ўпакоўкі. Запуск новага цэха дасць магчымасць павялічыць прыбытак, прыцягнуць новых партнёраў, выйсці на новыя рынкі збыту, як унутраныя, так і замежныя. У новым пункце сарціроўкі ўводзіцца ў эксплуатацыю машына па электроннай ачыстцы ягад з магутнасцю больш за восем тон у змену. Выкарыстанне ўстаноўкі, несумненна, палепшыць якасць прадукцыі. А гэта самае галоўнае, значыць, канкурэнтаздольнасць прадукцыі на рынку ўзрасце, і з'явіцца патэнцыяльныя магчымасці прыцягнуць новых партнёраў. У цэху таксама ўстаноўлена лінія па вытворчасці цукатаў (сушаных ягад) з магутнасцю выпуску больш за тону прадукцыі ў месяц. Лінія ўкамплектаваная замежным і айчынным абсталяваннем.

Дарэчы, на прадпрыемстве вырошчваюцца новыя культуры — айва японская, актэнідыя (міні-ківі), якія больш нідзе ў Беларусі не сустрэнеш. А тут іншаземцаў адаптавалі і прывучылі да нашых умоў. У новым цэху будзе перапрацоўвацца і гэтая прадукцыя. Дарэчы, свой вітамінны тавар «Палескія журавіны» прадаюць у Расію, Казахстан, дзевяць краін Еўропы і, вядома, спажыўцам Беларусі.

Фабрыка малака

Паспяховае сельгаспрадпрыемства ў сельскай мясцовасці — гэта рабочыя месцы, добрая зарплата, падтрымка сацкультбыту на вёсцы. Менавіта такім з'яўляецца флагман аграрнай індустрыі Піншчыны — ААТ «Парахонскае». У Пінскім раёне наогул адно з самых вялікіх у краіне пагалоўе буйной рагатай жывёлы. Раён — другі ў Брэсцкай вобласці і чацвёрты ў Беларусі вытворца малака. Найбольшая доля малочнай прадукцыі ў гэтым складніку — з «Парахонскага».

— У нас па-ранейшаму самая высокая ў краіне шчыльнасць пагалоўя, — гаворыць **дырэктар ААТ «Парахонскае» член Савета Рэспублікі Уладзімір ХРАЛЕНКА**. — А ўвогуле алгарытм такі: дадаём зямлі — дабаўляем і жывёлу, адначасова падымаем прадукцыйнасць статка. Так і рухаемся крок за крокам, кожны год нарошчваем валавую прадукцыю прыкладна на 10 працэнтаў. Шмат будуем. Летась пачалі ўзводзіць малочнатаварны комплекс у вёсцы Дубнавічы, зараз ён гатовы да здачы. Новая фабрыка малака разлічана на дойны статак ў тысячу галоў. Устаноўлена тэхналагічнае абсталяванне даільнай залы шведскай вытворчасці. Увядзенне ў строй новага комплексу дазволіць атрымліваць да чатырох тысяч тон малака гатункам «экстра» ў год. Важна, што ствараецца 27 рабочых месцаў. Персанал ужо падабраны.

Аб'ект узведзены за кошт уласных сродкаў прадпрыемства з прыцягненнем крэдытных рэсурсаў. Яго кошт склаў каля 12 мільёнаў рублёў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ГОМЕЛЬШЧЫНА

ТЭРЫТОРЫЯ СОНЕЧНАГА ДЗЯЦІНСТВА

АМАЛЬ 200 маленькіх жыхароў Петрыкава, што на Гомельшчыне, разам з бацькамі і педагогамі рыхтуюцца ладзіць навасэлле ў цалкам адноўленым будынку ясляў-сада № 5. Адкрыццё ўстановы дашкольнай адукацыі прымеркавана да святкавання Дня Незалежнасці Беларусі.

Яслі-сад № 5 у Петрыкаве — самая буйная ўстанова дашкольнай адукацыі ў раёне. Гэта лідар па ахопу выхаванцаў і па тэрыторыі. Тут таксама значная карысная плошча — дзве тысячы «квадратаў». Сёлета гэты петрыкаўскі садок адзначыў 40 гадоў свайго існавання.

Два гады таму было прынята рашэнне правесці капітальны рамонт тыпавога будынка і частковую мадэрнізацыю. Бо па выніках абследавання памяшканняў высветлілася, што ёсць праблемы з апорай сцен.

Падчас абнаўлення памяшканняў, згодна з праектам узмацнілі ўсе будаўнічыя канструкцыі. Акрамя таго, зрабілі тэрмарэнавацыю фасадаў, замянілі аконныя і вонкавыя дзвярныя блокі. Значную частку работ заняла і перакладка ўсіх унутраных інжынерных сетак. Пераклалі электрыку, сістэму ацяплення, водаправод, каналізацыю. Да таго ж у садку ўсталявалі новую аўтаматычную супрацьпажарную сістэму.

Са сродкаў абласнога бюджэту на ўсе работы па капітальным рамонце было выдаткавана амаль 1,7 мільёна рублёў і яшчэ 80 тысяч — на новую зручную гульнявую і спальную мэблю.

— Па праектнай магутнасці ахоп дашкольнай адукацыяй ва ўстанове разлічаны на 262 дзіцяці. Між тым у нас працуюць спецыяльныя групы, інтэграваная і лагапедычныя, у якіх па нормах павінна быць менш дзетак, таму садок звычайна наведваюць 200 дзяцей, — тлумачыць **загадчык ДУА «Яслі-сад № 5 г. Петрыкава» Валянціна ЗЯРНОВА**. — Дагэтуль, напрыклад, ва ўстанове не было прыстасаваных памяшканняў для работы лагапедаў. Цяпер у спецыялістаў асобныя пакоі для заняткаў, вылучылі і вялікі гардэроб. У гаспадарчай частцы прыстасавалі памяшканне для вырабу святочных дзіцячых касцюмаў, — дадае Валянціна Уладзіміраўна ды не хавае хвалявання і радасці за ўстанову, у якой працуе 36 гадоў:

— Зрабілі вельмі зручны медыцынскі блок. Цяпер ёсць «ізалятар» для дзетак, якія адчулі сябе блага ці крыху захварэлі. Праз вялікае шкло ў пакоі медработнік зможа сачыць за дзецьмі. Раней было не так утульна і даволі нязручна распланавана гэтая тэрыторыя. Зрабілі рэканструкцыю памяшканняў харчблока: вылучылі асобныя цэхі для сырой і гатовай прадукцыі.

Значна абнавілі і добраўпарадкавалі тэрыторыю навокал: замянілі ўязныя вароты і брамкі, зрабілі адмосткі і водаадвядзенне, заасфальтавалі сцежкі.

— Вельмі парадаваў падыход будаўнікоў і да пракладання знешняга водаправода, — зазначае загадчык установы. — Зрабілі чатыры выхады воднай сеткі. Вельмі зручна мыць дзіцячыя цацкі пасля прагулак, паліваць кветнікі і саджанцы. Усё квітнее і кажа «дзякуй!».

Цяпер на тэрыторыі размясціліся прывабныя ценявыя навесы, новыя гульнявыя комплексы, элементы малых архітэктурных формаў. Цікавае рашэнне будаўнікі прымянілі да афарбоўкі і ўпрыгожвання малюнкамі фасадаў будынка.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

У ТЭМУ

Сёлета ў Мазыры пачнецца будаўніцтва дзіцячага садка на 350 месцаў. Комплекс будынкаў будзе ўключаць адміністрацыйны корпус і восем дзвюх- і трохпавярховых блокаў для груп. Некаторыя з іх злучаць пераходныя галерэі, а вітражныя вокны ўпрыгожаць лесвічныя пралёты. Па перыметры ўсёй тэрыторыі размесцяцца гульнявыя пляцоўкі, зялёныя зоны, прадугледжаны невялікая аквазона, а таксама спартыўныя пляцоўкі з бяспечным мяккім пакрыццём.

У аграгарадку Ліцвінавічы Кармянскага раёна з апярэджаннем графіка працягваецца будаўніцтва школы. Па праекце тэрмін здачы гэтага сацыяльна значнага аб'екта меркаваўся на 8 лістапада. Аднак падрадная арганізацыя — ААТ «Будаўнічы трэст № 14» — узяла на сябе абавязацельства выканаць усе работы і здаць школу пад ключ да 1 верасня. Будаўніцтва вясковай школы — на асобым кантролі старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзя Салаўя.

У Гомелі ў канцы лета плануюць адкрыць пасля рэканструкцыі басейн СДЮШАР № 7. Аб'ект інфраструктуры, у якім вывучыліся плаваць і ставіць рэкорды шматлікія выдатныя спартсмены, быў пабудаваны ў 1978 годзе. У 2018-м пры правядзенні абследавання выявіліся парушэнні канструкцыі, басейн закрылі на рэканструкцыю. Перад будаўнікамі паставілі задачу замяніць перакрыцці, вентыляцыю, абліцоўку чашы басейна. Яго даўжыня 25 метраў, а максімальная глыбіня — 4,6 метра. Мантажныя работы і замена перакрыццяў практычна завершаны. Цяпер — час аздаблення.

Між тым да 3 ліпеня ў Гомелі плануецца ўвесці ў эксплуатацыю басейн на вуліцы Партовай — адну з найлепшых навучальна-трэніровачных баз абласнога вучылішча алімпійскага рэзерву ў Гомельскай вобласці.

«СТАРШЫЯ» ПА ВЁСЦЫ

У Гомельскім раёне старэйшыны населеных пунктаў і памочнікі старшынь сельсаветаў — «рухавікі» актыўнай грамадзянскай пазіцыі на вёсцы — дзеляцца сваімі натхняльнымі прыкладамі добраўпарадкавання родных мясцін.

Сакрэт папулярнасці — шчырае слова

Старшыня Прыбарскага сельскага савета Ірына ГОРЛЕНКА на пасадзе трэці год. У зоне яе адказнасці шэсць населеных пунктаў Гомельскага раёна, дзе пражывае амаль 1700 чалавек. Ірына Віктараўна спяшаецца расказаць аб неацэнным багацці яе сельскага савета — старасце вёскі Шчэрбаўка.

— Арганізаваць аднавяскоўцаў на добрыя справы, старацца, каб кожнаму з іх было ўтульна і камфортна, абараняць агульныя інтарэсы — такая задача **сельскага старасты**. У Шчэрбаўцы гэтую грамадскую місію больш за дзесяць гадоў выконвае **Валянціна СТАРЧАНКА**, — тлумачыць старшыня Прыбарскага сельсавета.

Шчэрбаўка — маленькая вёсачка амаль на мяжы Гомельскага і Рэчыцкага раёнаў. Сціплы куточак, здаецца, згубіўся сярод лясоў. Калі трапляеш сюды, радуе вока дагледжанасць, добраўпарадкаваныя падвор'і патанаюць у рознакаляровых красках. Каля кожнага дома — клумбы, кветнікі.

— Стараемся, каб прыгожа было па ўсёй вуліцы: абменьваемся кветкавай расадай, — кажа Валянціна Эдуардаўна.

Гэта яна ініцыявала нямала суботнікаў, акцый па добраўпарадкаванні ў Шчэрбаўцы. Летась, напрыклад, вяскоўцы чатыры разы збіраліся на работы па навядзенні парадку на сельскіх могілках. Прыбралі, высеклі хмызнякі.

Вяскоўцы збіраюць грошы і дбаюць, як купіць фарбу, каб абнавіць усе агароджы, пафарбаваць калодзеж.

— Як збіраю людзей на суботнікі? Ды вельмі проста: абзвоньваю, заходжу ў хаты: «Хадземце заўтра выйдзем, папрацуем, пакуль надвор'е! Вось і ўсе», — дзеліцца Валянціна Эдуардаўна і сціпла зазначае, што сакрэту сваёй папулярнасці на вёсцы не ведае. Можа, шчырае добрае слова.

— Амаль ніхто не адмаўляецца. Нават самыя пажылыя жыхары, якім цяжкая фізічная праца не па сілах, удзельнічаюць у зборы сродкаў, даюць неабходныя рабочыя прылады тым, хто працуе.

Таму для мясцовых жыхароў стала абсалютна натуральным — самастойна зрабіць «парк» адпачынку ў сваёй Шчэрбаўцы. Спачатку расчысцілі ад зарасніку пляцоўку на вуліцы, дзе калісь быў сметнік, усё вычысцілі, падрэзалі і прывабна сфарміравалі кроны старых дрэў, высадзілі новыя кусты, устанавілі арэлі. Сёлета, вясной сваімі рукамі змайстравалі яшчэ больш гульнявых прылад для дзяцей, малыя архітэктурныя формы, сваё месца занялі лавачкі ды столікі.

— Мясцовы прадпрымальнік Віктар Цімашкоў вельмі дапамагае будаўнічымі матэрыяламі. Сваімі рукамі робяць малыя архітэктурныя формы, лавы і ўсе нашы вось такія задумкі сям'я Кастраміных, дапамагае Аляксей Дарафееў і шмат-шмат мясцовых жыхароў, — усхвалявана расказвае староста, бо не хавае шчырай удзячнасці людзям. — Усе з задавальненнем згодныя дапамагчы. Мы робім гэта для дзяцей, каб яны гулялі ў прыгожым і бяспечным месцы!

Кожныя выхадныя разам працавалі над стварэннем малых архітэктурных формаў. Прыдумалі шмат цікавага: «будзільнік» і «рамонак» са старых шын. Збудавалі масток, паставілі арэлі і футбольныя вароты, а ствалы старых дубоў пабялілі і размалявалі. Таксама адрамантавалі і пафарбавалі дзве студні.

Валянціна Эдуардаўна расказвае, што жыхары Шчэрбаўкі на дасягнутым не збіраюцца спыняцца, бо планы па добраўпарадкаванні вёскі ў іх грандыёзныя. А пакуль мараць, што чалавек — прадавец па спецыяльнасці, даведаўшыся, як у іх прыгожа і дружна, згодзіцца прыехаць працаваць у іх вясковую краму, якая засталася без работніка.

Праекты і рашэнні

Сярод пераможцаў спаборніцтва па сацыяльна-эканамічным развіцці Гомельскага раёна ў 2020 годзе ў пазіцыі органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання як адзінаасобны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання пераможніцай абрана **памочнік старшыні Улукаўскага сельскага Савета дэпутатаў па пасёлку Іпуць — Таццяна КІРЖА**.

Так, ёй дастаўся вельмі складаны ўчастак для работы. Тут калісьці атрымалі жыллё супрацоўнікі чыгуначнай станцыі. Пасёлак Іпуць акружаны прамысловай зонай Гомеля. Няма добра развітай інфраструктуры. Былі праблемы і з наладжаннем транспартных зносін паміж пасёлкам і абласным цэнтрам. На аўтобусны прыпынак іпуцянцам дабірацца было вельмі доўга і нязручна.

Вырашыць пытанне, якое хвалявала сельскіх жыхароў, за мэту сабе паставіла менавіта Таццяна Кіржа. Заручыўшыся дапамогай дэпутатаў, пісала звароты, хадзіла на прыёмы і абгрунтоўвала, што грамадскі транспарт павінен пайсці да іх станцыі. Пытанне вырашылася, а імпэт у клопаце аб жыцці пасёлка застаўся.

Дабівалася вырашэння праблемы падтрымання ў належным стане пасялковай дарогі. Таццяна Лук'янаўна актыўна дапамагала ў добраўпарадкаванні мясцовага возера, якое стала любімым месцам адпачынку не толькі жыхароў Улукаўскага сельсавета, але і гараджан. Цяпер тут праходзяць дні пасёлка, вельмі прыгожа адзначаюць Купалле.

Некалькі месяцаў таму Таццяна Кіржа дапамагла ажыццявіць маладзёжную ініцыятыву іпуцянцаў.

— Маладыя бацькі марылі для дзяцей зрабіць сваімі рукамі гульнявую пляцоўку ў двары, — тлумачыць Таццяна Лук'янаўна. — Да мяне звярнуліся тры маладыя сям'і.

Разам распланавалі, як і што будзем рабіць. Сабралі грошы:

— Адгукнуліся многія: тыя, у каго ёсць малыя і тыя, у каго няма. Адрамантавалі старое спартыўнае абсталяванне, пафарбавалі, падварылі. Купілі і новае. Таты сканструявалі вельмі цікавую пясочніцу, можна нават у раёне выраб такіх наладзіць.

Цяпер збіраюцца зрабіць прыгожыя палісаднікі і кветнікі каля пад'ездаў:

— Плануем паставіць горку для скалалажання. Нас пыдтрымалі і арганізацыі раёна. Ёсць ахвотныя дапамагчы не толькі грашыма, але і ўласнымі рукамі.

Крыніцы каля возера Явіцкага.

Вады з крыніцы напіцца

Яшчэ адны актыўныя вяскоўцы, незаменныя памочнікі старшыні Улукаўскага сельскага Савета дэпутатаў у сваёй акрузе — **дэпутат Надзея ВАРАНЕНКА** і **памочнік старшыні сельвыканкама па пасёлку Будацін Таццяна ХАДОРЧАНКА**, якая таксама догі час была дэпутатам.

Жанчыны актыўна дапамагалі ажыццяўляць складаны і працаёмкі «вясковы праект» на тэрыторыі Гомельскага раёна — добраўпарадкаванне і аднаўленне крыніц каля возера Явіцкага, якое атрымала сваю назву ад прозвішча мясцовых паноў, што паставілі на беразе маёнтак. Ад сядзібы не засталося і падмурка, а крыніца б'е дагэтуль, напаўняючы бетонныя кольцы міні-студні. Па ваду сюды цяпер чарга, кажа Надзея Вараненка:

— Вельмі шмат людзей прыязджае з Гомеля, бяруць бочкамі ваду. Яна тут вельмі смачная. Я, напрыклад, выкарыстоўваю яе не толькі для пітва, але і для закрутак.

Надзея Іванаўна згадвае, як на вясковым сходзе разам са старшынёй Улукаўскага сельвыканкама і сельскага Савета дэпутатаў Жаннай Бізняй прапанавалі аднавіць старажытныя крыніцы.

— Тэрыторыя была амаль цалкам затоплена, гублялася нават маленькая сцяжынка ў зарасніках. Але мясцовыя людзі ведалі, што тут б'юць найчысцейшыя крыніцы, дабіраліся неяк да вады.

Дапамаглі ажыццявіць «вясковы праект» валанцёры экалагічнай арганізацыі, жыхары навакольных вёсак, уладальнікі лецішчаў. Зрабілі водапаніжэнне мясціны, зраўнялі і ачысцілі ад хмызнякоў бераг возера, абсталявалі зручны падыход і альтанку-навес:

— Побач пасёлак Ільіч і буйны дачны кааператыў. Цяпер усе едуць па найчысцейшую пітную ваду і шчыра дзякуюць, што на калісьці занядбанай тэрыторыі цяпер крыніцы і добра ўмацаванае месца для забору вады. Не так даўно бралі яе пробы і рабілі аналіз, дарэчы, — нуль жалеза, нуль нітратаў.

Увогуле Улукаўскі сельсавет на тэрыторыі Гомельскага раёна самы буйны — тут стала пражывае больш як 12 тысяч чалавек. Сёлета ў межах акцыі «Уладкаваць малую радзіму», прымеркаванай да 75-годдзя Вялікай Перамогі, жыхары вёсак Гомельскага раёна змаглі зрабіць свой унёсак у захаванне ўдзячнай памяці.

На сімвалічным месцы — паміж пасёлкамі Юбілейны і Перамога ва Улукаўскім сельсавеце — заклалі бяразавую алею «Юбілей Перамогі». 75 саджанцаў у знак падзякі за кожны мірны год высадзілі недалёка ад мемарыяла, дзе ў брацкім пахаванні вечны супакой знайшлі амаль 200 герояў Вялікай Айчыннай вайны, якія загінулі, вызваляючы Гомельскі раён.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

№ лота	Наименование объекта / Адрес участка	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.)	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке
1	Не завершенный строительством законсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Кедровая 1-я, 15** (площадь застройки 108 кв. м, готовность 12 %) и земельный участок	140100000001021159	0,0998	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	**36 879,35**	7 300,00	**2 717,64**	0,0037 га – охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации; 0,0058 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,0998 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях	Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение, канализация
Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220, и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232									**2 700,00 рубля**
Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.					**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с №BY73AKBB30127803600111000000 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код банка AKBBBY21100, УНП 290433924 в срок до 17.30. 22.07.2020 г.**				

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220, и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

• в течение одного месяца с момента государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• разработать в установленном порядке проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома;

• представить изготовленную проектную документацию на согласование в Брестский городской исполнительный комитет;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

Аукцион состоится 28 июля 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал

Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 26.06.2020 г. до 17.30 22.07.2020 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.
Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www gki.gov.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-41597 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин № 8 «Ромашка»), обшей площадью 233,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Гастелло, 2

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 423650100006000396, площадью 0,1180 га (назначение – обслуживание магазина), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Гастелло, 2. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0154 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,0100 га; земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов и других линейных инженерный сооружений, площадью 0,1095 га

Начальная цена продажи – 184 800 руб.
(сто восемьдесят четыре тысячи восемьсот рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 18 480 руб.
(восемнадцать тысяч четыреста восемьдесят рублей)

ОАО «Торгово-производственная фирма «Лида», 231300, г. Лида, ул. Кирова, 6, тел. 8-0154-617-577, факс 8-0154-522-540

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона:
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1,5 % от конечной цены продажи объекта;
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по изготовлению и регистрации технического паспорта на капитальное строение в сумме 306,80 руб.; по проведению независимой оценки в сумме 660 руб. и по проведению экспертизы достоверности оценки в сумме 287,10 руб.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 13 июля 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.03.2020 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 09 июля 2020 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: зерноуборочный комбайн «Лида-1300», заводской номер 627, 2002 г. в., двигатель дизельный 6-цилиндровый (184W/250 л. с.) в комплекте с жаткой и транспортной тележкой. Местонахождение: Лидский р-н, а. г. Можейково.
Начальная цена продажи – 15 072 руб. (пятнадцать тысяч семьдесят два рубля) с учетом НДС.
Сумма задатка – 753 руб. (семьсот пятьдесят три рубля)

Продавец – Лидское районное сельскохозяйственное унитарное предприятие «Можейково», 231325, Лидский р-н, аг. Можейково, тел. 8-0154-622-711

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона: аукцион без условий. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Условия оплаты – по договоренности сторон.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 14 июля 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.05.2020 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 10 июля 2020 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

ГАЛОЎНАЕ — СТАБІЛЬНАСЦЬ І БЯСПЕКА

ПРА гэта гаварыў перад сваімі выбаршчыкамі дэпутат Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання ад Магілёўскай вобласці, начальнік Магілёўскага інстытута МУС генерал-маёр міліцыі Валерый ПАЛІШЧУК. У рамках Адзінага дня інфармавання ён сустрэўся з асабовым складам Шклоўскага і Мсціслаўскага РАУС, а таксама жыхарамі Горацкага, Дрыбінскага і Мсціслаўскага раёнаў.

Ён нагадаў, што было зроблена за 25 гадоў існавання незалежнай Беларусі.

— Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заўсёды адзначае, што галоўная каштоўнасць дзяржавы — гэта нашы людзі, якія сваім талентам, творчасцю і працавітасцю прымнажаюць яе славу, натхняюць суайчыннікаў на добрыя справы, з'яўляюцца сапраўднымі патрыётамі сваёй Радзімы. Разам мы сіла і гарантыя ўпэўненай будучыні нашай краіны! Без ведання мінулага, няма дарогі ў будучыню. Урокі гісторыі важна памятаць, каб не паўтараць памылкі зноў. Да добрага хутка прывыкаеш, але трэба ўспомніць, які быў пачатак нашай незалежнасці, — адзначыў Валерый Палішчук у сваёй прамове.

Сенатар пагутарыў з жыхарамі аграгарадка Аўсянка Горацкага раёна, расказаў ім аб сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, аб рабоце верхняй палаты Нацыянальнага сходу. Разам з жыхарамі Дрыбінскага і Мсціслаўскага раёнаў абмеркаваў сітуацыю з пандэміяй, магчымасці ўмацаваць здароўе ў межах краіны, закрануў тэмы выхавання падрастаючага пакалення, прафілактыкі злачынстваў і іншыя.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Магілёўскага інстытута МУС.

Важна захаваць кансалідацыю ў грамадстве

У Воранаўскім раёне, што на Гродзеншчне, прыём грамадзян правёў член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігар ГЕДЗІЧ. У рамках рабочага візіту сенатара прайшла сустрэча з работнікамі сферы культуры раёна.

voran.by

Асноўнай тэмай сустрэчы сталі не толькі надзённыя праблемы ўстаноў культуры ў перыяд нестабільнай эпідэміялагічнай сітуацыі, але і развіццё нашай краіны за чвэрць стагоддзя.

Падтрымліваць канкурэнтаздольны ўзровень эканомікі, захоўваць і пашыраць свае пазіцыі на сусветнай арэне становіцца ўсё цяжэй. І ўдвая складаней дасягаць гэтых мэт, калі ў якасці абавязковай умовы стаіць задача шырокага сацыяльнага забеспячэння ўсіх слаёў насельніцтва, напрыклад, забеспячэння нізкага ўзроўню беспрацоўя, бясплатных адукацыі і медыцыны, сацыяльнай падтрымкі малазабяспечаных і гэтак далей. Менавіта гэты шлях развіцця абраны ў нашай краіне. Як бы цяжка ні было, нельга адступаць ад прынцыпу падтрымання ўзроўню сацыяльных гарантый для нашых людзей. У гэтых умовах вельмі важная кансалідацыя нашага народа, падкрэсліў сенатар.

Паводле «Воранаўскай газеты».

Магчымасці для развіцця

З працоўным калектывам Барысаўскага завода пластмасавых вырабаў сустрэлася член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Алена ЗЯБЛІКАВА.

Сенатар падчас сустрэчы закранула шырокае кола пытанняў, якія датычацца сучаснага жыцця Барысава і раёна, добраўпарадкавання, эпідэмічнай сітуацыі і іншых актуальных праблем.

Акрамя таго, яна адзначыла, што работнікі і кіраўніцтва Барысаўскага завода пластмасавых вырабаў адны з першых аказалі дапамогу медыкам у барацьбе з COVID-19. Не засталіся без увагі і працоўныя дасягненні завода.

— У прадпрыемства ёсць усе магчымасці для далейшага развіцця, павышэння канкурэнтаздольнасці і захавання ўпэўненых пазіцый на рынку, — рэзюмавала Алена Зяблікава.

Паводле раённай газеты «Адзінства».

АКЦЫЯ

Разам упрыгожылі свой двор

Жыхары Краснаполля далучыліся да рэспубліканскай акцыі БРСМ

МАЛАДЗЁЖНЫ праект БРСМ «#Разам з бацькамі» падтрымалі краснапольскія дэпутаты, грамадская арганізацыя «Белая Русь», прадпрыемства «Жылкамгас» і шматдзетныя сем'і дамоў №№ 22 А і 22 Б па вуліцы Ціміразева. Наводзіўся парадак на прыдамавых тэрыторыях і на дзіцячай пляцоўцы.

— Гэтая пляцоўка выбрана невыпадкова, — адзначыла **старшыня Краснапольскага Савета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН**. — Агульная колькасць дзяцей, якія тут пражываюць, самая вялікая ў райцэнтры. Першы сакратар раённай арганізацыі БРСМ Марыя Шайтура разам з нашым дэпутатам райсавета па Ціміразеўскай акрузе № 2 Наталляй Герашчанкай правялі папярэднюю інфармацыйную работу сярод насельніцтва. Радуе, што так шмат сем'яў адгукнулася на наш заклік. Такія мерапрыемствы яднаюць пакаленні, выхоўваюць у падлетках любоў да сваёй радзімы.

Удзельнікі акцыі фарбавалі лаўкі і дзіцячыя арэлі, наводзілі парадак з пясочніцамі і скрынямі, бялілі бардзюры. Арганізацыя «Белая Русь» забяспечыла ахвотных фарбамі і мелам, а «Жылкамгас» устанавіў для дзяцей новую пясочніцу. Літаральна за гадзіну дзіцячая пляцоўка зайграла новымі фарбамі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота дадзена рэдакцыяй раённай газеты «Чырвоны сцяг».

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 25 чэрвеня 2020 года.**